№ 1 (60)/ 2007

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК – ВАРШАВА, студзень-люты 2007 г.



(Фота Р. Трубчыка)

*Лідзкі замак.*

## А. ЛУКАШЭНКА МУСІЦЬ АДКАЗВАЦЬ ЗА ФАЛЬСІФІКАЦЫЮ ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 19 САКАВІКА 2006 г.

**19 студзеня 2007 г. Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ перадаў у Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь заяву.** У заяве Сойм паставіў патрабаваньне аб узбуджэньні крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі апошніх прэзыдэнцкіх выбараў. Аб фальсіфікацыі 23 лістапада 2006 года паведаміў Аляксандр Лукашэнка падчас прэс-канфэрэнцыі для ўкраінскіх журналістаў.

Па гэтаму факту 10 сьнежня 2006 г. Сойм прыняў адмысловую пастанову, ў выкананьне якой была пададзена заява ў Вярхоўны суд.

### *ПАСТАНОВА*
### *Аб пытаньні ўзбуджэньня крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі выбараў*

23 лістапада на прэсавай канфэрэнцыі з украінскімі журналістамі кіраўнік выканаўчай улады Беларусі Аляксандар Лукашэнка заявіў, што

ён і ягоная ўлада сфальсіфікавалі выбары прэзыдэнта на Беларусі, якія адбываліся 19 сакавіка гэтага году. Выказьнік назваў свае лічбы і адсоткі сфальсіфікаваных галасоў, якія сьведчаць аб праведзеных маніпуляцыях.

У сувязі з гэтым Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ пастанаўляе:

1. Выступіць заяўнікам перад Вярхоўным Судом Беларусі па пытаньні ўзбуджэньня крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня на прэзыдэнцкіх выбарах кіраўніком выканаўчай улады грамадзянінам Лукашэнкам Аляксандрам Рыгоравічам. 2. Падрыхтоўку і падачу іскавай заявы і давер выступаць ад імя Сойму Партыі БНФ даручыць кіраўніцтву Партыі БНФ з правам подпісу намесьнікам старшыні Партыі Юрыем Беленькім .

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***

*10 сьнежня 2006 г., г. Менск*

* * *

### *У Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь*

***Заяўнік: Сойм Кансэрватыўна-Хрысціянскай Партыі – БНФ Па даручэньні Сойму намеснік Старшыні Партыі Юры Беленькі***

### *Заява*

23 лістапада 2006 года Аляксандр Лукашэнка, які займае вышэйшую службовую пасаду ў дзяржаве, падчас прэс-канферэнцыі для ўкраінскіх журналістаў агучыў інфармацыю наступнага зместу:

„…Да, последние выборы мы сфальсифицировали. Я уже западникам это говорил. За президента Лукашенко проголосовало 93,5 процента. Говорят – это не европейский показатель. Мы сделали 86. Это правда было. И если сейчас начать пересчитывать бюллетени, то я не знаю, что с ними делать вообще. До выборов нам говорили, что если будут примерно европейские показатели на выборах, то мы ваши выборы признаем. Мы собирались сделать европейские показатели. Но тоже, видите, не получилось. Запад пообещал, что если итоги будут европейские, то все будет нормально. Сделали европейские – ненормально".

Гэтая інфармацыя была агучана па Беларускім тэлебачанні падчас прамой трансляцыі прэс-канферэнцыі і распаўсюджана сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку агенцтвам БелаПАН (http://naviny.by/rubrics/politic/2006/11/23/ic_news_112_262647/)і газетай „Народная Воля" №№192-193 за 1 снежня 2006 г.

Ставім патрабаванне аб узбуджэнні крымінальнай справы ў сувязі з паведамленьнем А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 г. Паведамленьне А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 г, ўтрымлівае прамое парушэнне артыкула 192 „Парушэньне заканадаўства аб выбарах, рэферэндуме або адкліканні дэлутата" і артыкула 424 „Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі." Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Грубае парушэнне А. Лукашэнкам заканадаўства Рэспублікі Беларусь нанесла вялікія страты дзяржаўным інтарэсам. Парушэнне агульнапрызнаных міжнародных нормаў правядзеньня дэмакратычных выбараў стала адной з прычынаў скасаваньня у 2006 годзе гандлёвых прэферэнцыяў для Беларусі з боку краінаў Эўразвязу і Канады.

Дадатак: Аудыёкопія паведамлення А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якое агучана 23 лістапада 2006 года падчас прэс-канферэнцыі для ўкраінскіх журналістаў, на магнітным носьбіце (дыскета).

*19 студзеня 2007 г.* ***Юры Беленькі***

*Матэрыял падрыхтаваны інфармацыйнай камісіяй Кансэрватыўна-Хрысціянскай Партыі – БНФ*

# ПАТРАБАВАНЬНЕ АБ АДКАЗНАСЬЦІ ЗА ФАЛЬСІФІКАЦЫЮ ВЫБАРАЎ

*11 лютага 2007 г. Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ разгледзеў адказ Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь на сваю заяву, ў якой ставіў патрабаваньне аб узбуджэньні крымінальнай справы ў сувязі з паведамленьнем А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў 19 сакавіка 2006 г. (Прыводзім копію ліста Вярхоўнага суду)*

*Вярхоўны суд пры наяўнасьці парушэньня заканадаўства мае неабходную кампэтэнцыю накіраваць заяву ўворганы крымінальнага перасьледу. Пра гэта было заяўлена намесьнікам старшыні Партыі Сяргеем Папковым 19.01.2007 г. на прыёме ў суддзі Вярхоўнага суда пры перадачы заявы. Аднак Намесьнік старшыні Вярхоўнага суда Шкурдзюк Ж.Б. даў фармальны адказ.*

*У прадаўжэньне гэтай справы Сойм Партыі прыняў рашэньне накіраваць у Пракуратуру Рэспублікі Беларусь заяву наступнага зьместу:*

У Пракуратуру Рэспублікі Беларусь
Заяўнік:
Сойм Кансэрватыўна-Хрысціянскай Партыі – БНФ
Па даручэньні Сойму намеснік Старшыні Партыі
Юры Беленькі
г. Мінск, вул. Цікоцкага, д. 2, кв. 419

### *Заява*

У адпаведнасьці з арт.10 Закона „ Аб Пракуратуры Рэспублікі Беларусь" заяўляем аб небходнасьці пракурорскага рэагаваньня і прыняцьця мераау у сувязі з грубым парушэньнем заканадаўства сутнасьць якога ў наступным:

23 лістапада 2006 года Аляксандр Лукашэнка, які займае вышэйшую службовую пасаду ў дзяржаве, падчас прэс-канферэнцыі для ўкраінскіх журналістаў агучыў інфармацыю наступнага зместу: „…Да, последние выборы мы сфальсифицировали. Я уже западникам это говорил. За президента Лукашенко проголосовало 93,5 процента. Говорят – это не европейский показатель. Мы сделали 86. Это правда было. И если сейчас начать пересчитывать бюллетени, то я не знаю, что с ними делать вообще. До выборов нам говорили, что если будут примерно европейские показатели на выборах, то мы ваши выборы признаем. Мы собирались сделать европейские показатели. Но тоже, видите, не получилось. Запад пообещал, что если итоги будут европейские, то все будет нормально. Сделали европейские – ненормально".

Гэтая інфармацыя была агучана па Беларускім тэлебачаньні падчас прамой трансляцыі прэс-канферэнцыі і распаўсюджана сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку агенцтвам БелаПАН (http://naviny.by/rubrics/politic/2006/11/23/ic_news_112_262647/) і газэтай „Народная Воля" №№192-193 за 1 сьнежня 2006 г.

Паведамленьне А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 г, ўтрымлівае прамое парушэньне артыкула 192 „Парушэньне заканадаўства аб выбарах, рэфэрэндуме або адкліканьні дэлутата" і артыкула 424 „Злоўжываньне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі." Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Грубае парушэньне А. Лукашэнкам заканадаўства Рэспублікі Беларусь нанесла вялікія страты дзяржаўным інтарэсам. Парушэньне агульнапрызнаных міжнародных нормаў правядзеньня дэмакратычных выбараў стала адной з прычынаў скасаваньня ў 2006 годзе гандлёвых прэфэрэнцыяў для Беларусі з боку краінаў Эўразвязу і Канады.

Пытаньне аб адказнасьці за грубае парушэньне заканадаўства намі было пастаўлена перад Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь 19 студзеня 2007 г. Суд не адмаўляе наяўнасьці парушэньня заканадаўства спадаром Лукашэнкам А.Г., аднак не прыняў мераў для вырашэньня пытаньня ў адпаведнасьці з сваёй кампетэнцыяй і даў фармальны адказ.

### *Дадаткі:*

**1.** Аудыёкопія паведамленьня А. Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў, якое агучана 23 лістапада 2006 года

Ваша заява ад імя сойма Кансэрватыўна-Хрысціянскай Партыі – БНФ аб узбуджэнні крымінальнай справы па выніках галасавання на выбарах 19 сакавіка 2006 г. пакінута без задавальнення ў сувязі з тым, што пастаўленыя пытанні не ўваходзяць у кампетэнцыю Вярхоўнага Суда.

Дадатак: 1 дыскета.

Намеснік
Старшыні
Вярхоўнага Суда
Рэспублікі Беларусь — Шкурдзюк Ж.Б.

*Адказ Вярхоўнага Суда. 23.01.2007.*

падчас прэс-канфэрэнцыі для ўкраінскіх журналістаў, на магнітным носбіце (дыскета). **2.** Копія заявы ў Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь. **3.** Копія адказу Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь. **4.** Выпіска з пратаколу паседжаньня Сойму Кансэрватыўна- Хрысьціянскай Партыі – БНФ.

*11 лютага 2007 г.*

***Юры Беленькі***

*14 лютага 2007 г. заява накіраваная ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь.*

***Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*14.02.2007 г.*

# НЕБЯСЬПЕКА ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Мінуў месяц пасьля нафта-газавай сваркі пуцінскага рэжыму з Лукашэнкам. Мы бачым пэўныя перамены ў фразэалёгіі Масквы і рэжыму на Беларусі і шчыльную дымавую заслону ў так званых СМІ. Тут важна рэальна бачыць, што адбываецца і не палічыць фразэалягічную траскатню за сапраўднасьць.

Генэральная лінія Крамля на ўлучэньне Беларусі ў склад Расеі застаецца нязьменнай, гэтак жа як і тактыка „інтэграцыі" і так званай „союзнай дзяржавы". Застаецца таксама ідэя-фікс Лукашэнкі заняць пасад у Крамлі і пакіраваць імпэрыяй. Таму палітыку „інтэграцыі" і „союзнай дзяржавы" рэжым таксама падтрымлівае і будзе падтрымліваць. Дзеяньні Масквы па інкарпарацыі Беларусі цалкам узгоднены з Лукашэнкам і разьвіваліся па трох асноўных накірунках:

– прывязка беларускай эканомікі і гандлю да расейскай эканомікі і да залежнасьці ад расейскіх энергэтычных рэсурсаў;
– пераняцьце інфармацыйнага кантролю пад палітыкай і працэсамі ў Беларусі шляхам аб'яўленьня так званай „союзнай дзяржавы" (аб'явілі ў сьнежні 1999 г.) і сфармаваньня структураў гэтага палітычнага фантому, дзе расейская бюракратыя і расейская разьведка стварылі цэлы апарат;
– стварэньне і арганізацыя ў Беларусі прарасейскай палітычнай эліты і наступнае выкарыстаньне яе для падтрыманьня (ці перамены) прамаскоўскай улады (пад выглядам „дэмакратызацыі" рэжыму).

Ёсьць яшчэ чацьвёрты стратэгічны і заўсёдны накірунак расейскай палітыкі на Беларусі – гэта пастаяннае, пасьлядоўнае і неперапыннае вынішчэньне беларускай мовы, беларускай асьветы, адукацыі, навукі, гісторыі, усяго беларускага этна-культурнага існаваньня. Этнацыд і русіфікацыя (якія ў 1920-1940-х гг. ператварыліся ў генацыд) – гэта асноўная лінія рускай палітыкі на Беларусі, на якой выбудоўваюцца ўсе астатнія.

Спэцыфічным у гэтай цяперашняй імпэрскай палітыцы зьяўляецца тое, што ажыцьцяўляецца яна пры канкрэтным удзеле і дапамозе немцаў, якія ўключыліся ў яе ў канцы 1996 г. і ўзялі на сябе ў асноўным трэці накірунак нішчэньня Беларусі (г. зн. стварэньне кампрадорскай ненацыянальнай палітычнай эліты). Сумесныя дзеяньні рэжыму, гансвікаў, цапфаў, фрыкаў і КГБ-ФСБ мелі нядобрыя вынікі – быў стлумлены нацыянальны грамадзкі




(Фота Я. Ляўчука)

*Беларусь за кратамі (Віцебск).*

ўздым 1996-97 гг., расколаты Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і створана неадраджэнская (не накіраваная на нацыянальную ідэю) псэўдаапазыцыя.

Удзел немцаў у расейскай імпэрскай палітыцы сьведчыць пра геапалітычны характар канфлікту змаганьня за Беларусь, паказвае на вельмі сур'ёзную пагрозу нашай дзяржаўнай незалежнасьці і нацыянальнаму існаваньню (паўтараецца сітуацыя канца 18-га стагоддзя, калі расейцы зь немцамі ліквідавалі Вялікае Княства Літоўскае). Мушу дадаць, што нядаўняя газавая вайна Пуціна супраць Беларусі таксама была распрацаваная і пачатая пад уплывам немцаў, пра што выразна выказваўся Г. Шродэр 18-га студзеня ў Бэрліне на „расейска-германскай сустрэчы" пад назовам „Стратэгічнае партнёрства паміж Расеяй і Нямеччынай", дзе саюзьнікі раіліся аб сумесных дзеяньнях на Беларусі. (Усё прыкрываецца імкненьнем „дэмакратызаваць" Беларусь).

Асноўная палітычная барацьба (барацьба за Беларусь) сканцэнтравалася якраз вакол трэцяга накірунку – вынішчэньня нацыянальных беларускіх сілаў, асобаў і арганізацыяў і стварэньне прамаскоўскай палітычнай прысутнасьці. На гэта Масквой былі кінутыя маштабныя сілы і сродкі, створана Хартыя-97, Эўрапейскі Гуманітарны Унівэрсітэт, шэраг газэтаў, прафсаюзаў, маса іншых дробных праектаў (тыпу РНЕ, „казакоў" і т.п.). Адначасна нішчылі беларускія навучальныя ўстановы, творчыя саюзы, радыёстанцыі і нават радыёпраграмы (напрыклад, „Голас душы").

І ўсё ж задушыць Беларускую ідэю ні расейцам, ні немцам не ўдалося. Нягледзячы ні на што яна жыве і набірае сілы (хоць нацыянальна-культурныя страты за гэты час адбыліся велізарныя).

Адначасна пастаянна вырастае і нагадвае пра сябе ўнутраны акупацыйны канфлікт паміж антыбеларускімі сіламі – барацьба за Крэмль. Як толькі надыходзяць прызыдэнцкія выбары ў Расеі – адразу абвастраецца гэты канфлікт. Перад папярэднімі выбарамі гэта былі „мухі-катлеты", цяпер – нафта-газавая свара.

Я ўжо пісаў пра тактычны пралік пуцінскай групы, якая паставіла задачу працягу існаваньня сваёй улады ў залежнасьць ад злучэньня з Лукашэнкам (ад магчымасьці інкарпараваць Беларусь). Як гэта ня дзіўна, яны не зразумелі (падвяла, відаць, гэбоўская салдафоністасьць), што Лукашэнка ня прыме ніякой пасады ў Расеі, акрамя прэзыдэнцкай.

Гэбізм здольны толькі на грубую палітыку і спадзяецца на сілу. З гэтых пазыцыяў і была зроблена нафта-газавая атака на рэжым Лукашэнкі з мэтай прымусіць Лукашэнку пагадзіцца на інкарпарацыю на ўмовах Пуціна. Але ў выніку Пуцін палітычна прайграў, апёкся і з добрай мінай пры кепскай гульні разважае цяпер пра пераход на рынкавыя дачыненьні. Гэтае словаслоўе абазначае, што расейцы, скарыстаўшы прывязанасьць беларускай эканомікі да расейскіх энэргарэсурсаў і прыярытэтнае партнёрства ў гандлі, будуць паступова, крок за крокам разбураць цяперашнюю беларускую

эканоміку, вобразна кажучы, зацiскаць на шыі пятлю, каб загнаць Лукашэнку ў кут. (Беларускі народ тут у разьлік не бярэцца).

Ёсьць шмат магчымасьцяў супроцьдзейнічаць гэтай ізноў жа нямецка-расейскай палітыцы (прыняць антыбеларускі, нібыта рынкавы, тып дзеяньняў крамлёўцаў падштурхнулі, як я ўжо адзначыў, немцы). Аднак, як мы бачым, рэжым Лукашэнкі асабліва не стараецца, эканамічна засьцерагчыся ад Расеі. Гучаць толькі заявы, дэклярацыі і ўсё ў асноўным круціцца ў палітыканскай сфэры. Прыязджаюць пагаварыць то Зюганаў, то Рагозін, то Праханаў, то ціхі непрыяцель Беларусі рускі немец Рар, то прафэсійны эўрабюракрат Ван дэр Ліндэн і ўсё так нікуды не рухаецца, рэжым даволі спакойны, з абодвух бакоў гавораць пра інтэграцыю.

Пазыцыя Эўразьвязу, нягледзячы на бюракратычнае словаслоўе аб гатовасьці ўспрыняць Лукашэнку пры ўмове адпаведных крокаў зь яго боку, не выглядае, аднак, сур'ёзнай (і рэжым, трэба сказаць, адэкватна яе ацэньвае). Ніякі рэжым ня будзе рабіць першым ніякіх там „крокаў" і выконваць патрабаваньні, каб заслужыць на ласку. Выстаўляючы патрабаваньні, брусэльцы ўсё разумеюць. Калі зыходзіць не з імітацыі, а з патрэбы практычных дзеяньняў, нацэленых на вынік, то „першыя крокі" павінен рабіць таксама Эўразьвяз. Гэтым можна ўключыць працэс мінімальнага руху. Але ў Эўропе цяпер камандуюць немцы і не сьпяшаюцца даваць рэжыму шанец на заходні вектар палітыкі і найперш таму, што ў гэтым не зацікаўленая Расея.

Палітычны пройгрыш Пуціна ў нафта-газавай сварцы ажывіў надзеі непуцінскіх і контрапуцінскіх сілаў у Расеі ў барацьбе за ўладу. Выглядае на тое, што яны не супраць выкарыстаць у гэтай барацьбе Лукашэнку ў якасьці зьнешняга тарана (бо ўнутры ў Расеі нікога ў альтэрнатыву Пуціну няма, пуціністы ўсіх выдушылі). Лукашэнка пра гэта ведае. Рэальнай альтэрнатывай мог бы стаць ён сам. (Нядаўна – пасьля „візітаў" у Менск – у Расеі адчынілі нават старонку ў Інтэрнэце –„Лукашэнка 2008", дзе прапагандуюць яго на ... прэзыдэнта РФ). Для Беларусі такім чынам зноў можа ўзьнікнуць вялікая і рэальная небясьпека, бо адновіцца гандаль Айчынай. Здаецца ўжо ўсе зразумелі, што за вышэйшую пасаду ў Крамлі гэтае шклоўскае няшчасьце Беларусі здасьць і Беларусь, і зямлю, і народ. Калі б авантура з аншлюсам сапраўды пачалася б (што ня выключана), то спыніць яе ўжо магла б толькі вайна, і беларусы да гэтага павінны быць падрыхтаваныя. За свабоду і за існаваньне трэба ваяваць.

Спэцыфіка рускага гэбізму і канкрэтная сітуацыя, што склалася, паказваюць, што Пуцін і ягонае асяроддзе павінны шукаць іншыя мэтады, каб захаваць уладу. Самы просты, правераны і магчымы варыянт для Пуціна – гэта трэці тэрмін прэзідэнцтва (калектыўныя лісты „расіян", прадпрыемстваў, рэгіёнаў з патрабаваньнем „паслужыць" Расеі" і г. д.)

Другі магчымы варыянт можа здасца нечаканым, але дапушчальны, тым больш, што расейскія спэцслужбы маюць тут вялікі вопыт і практыку, адчуваюць сябе як рыба ў вадзе. Маецца на ўвазе зьмяшчэньне Лукашэнкі і стаўленьне новай марыянеткі шляхам змовы і перавароту. На магчымасьць такіх дзеяньняў ужо зьвярнуў увагу Валеры Костка ў нядаўнім сваім артыкуле зьмешчаным у сеціве (<bielarus.net>, Цугцванг у цэйтноце.) Гэты варыянт падзеяў вельмі небясьпечны для дзяржаўнасьці Беларусі, таму што (калі не пачне супраціўляцца народ) пацягне наўпрост інкарпарацыю краіны ў імпэрыю.

Што рабіць беларусам калі крамлёўцы пачнуць у нас сваю любімую і правераную тактыку – прамаскоўскі пераварот пад сьцягам барацьбы з дыктатурай? Дзеля магчымасьці такога роду перамены ўлады і зьмены сатрапаў, расейскі гэбізм стварае ў краінах свае прамаскоўскія (дэмакратычныя, рэвалюцыйныя, левыя, канструктыўныя, рэгіянальныя, радыкальныя, і т.п.) кіруемыя апазыцыі. Беларусам трэба разумець, што так званая „аб'яднаная дэмакратычная апазыцыя", створаная ў Беларусі Гансам Вікам і КГБ – гэта не альтэрнатыва прамаскоўскаму рэжыму, а альтэрнатыва беларускаму нацыянальна-дэмакратычнаму Адраджэньню. Да ўлады ў Беларусі ў гэтай сітуацыі такія „апазыцыянеры" ня прыйдуць (бо не дзеля гэтага іх сабралі), але могуць падтрымаць патрэбную Маскве перамену ўлады, якая ліквідуе кіраваньне Лукашэнкі. Менавіта на гэтым (ліквідацыя кіраваньня Лукашэнкі) зацыклена іхняя „апазыцыйная" „ідэалёгія". Зрэшты ў сваіх паводзінах, як сьведчыць практыка, яны ня ёсьць самастойнымі. (Тут я зраблю невялікую дэгрэсію. Зьвяртаю ўвагу на „дробязь" – на двухсэнсоўнае выкарыстаньне слова „перамена" (якое падкідваюць звычайна моладзі). Гэта прыклад таго што масавае палітычнае змаганьне ня церпіць неакрэсьленасьці і эўфемізмаў.)

Пазыцыя падтрымкі перавароту дала б повад маскоўскай прапагандзе палітычна апраўдаць пераварот і заблытаць беларускае грамадзтва. Абсадка ўлады ў Беларусі сваімі людзьмі, ліквідацыя „шкодных элемэнтаў" і хуткі аншлюс пад выглядам стварэньня „саюзнай дзяржавы" сталася б ужо справай кароткага часу і абкатанай імпэрскай тэхнікі.

Трэба разумець выразна, цьвёрда і адназначна, што ў выпадку разгортваньня такога сцэнару, беларусы і ўсе нацыянальна-дэмакратычныя сілы не павінны прызнаваць і падтрымліваць ні дыктатара, ні прамаскоўскі пераварот у асяроддзі дыктатуры. Гэта перамена ў межах аднае зьявы, дзеля мэтаў гэтае зьявы. Нават расейская літаратура асэнсавала сутнасьць такой расейскай палітыкі („народ безмолвствует", калі хто памятае). Па вялікаму кошту тут была б не перамена, а перагрупоўка сілаў прамаскоўскай улады супраць свабоды і незалежнасьці Беларусі. Беларускае нацыянальна-дэмакратычнае Адраджэньне павінна разгортваць у гэтай сітуацыі сваю антыімперскую сілу.

Паўтаруся, гэтыя мае развагі, выкліканыя артыкулам В. Косткі, нельга разглядаць як выказ нейкіх вядомых плянаў нейкіх групаў, ці сьцьвярджэньне аб падрыхтоўцы нейкіх пэўных падзеяў. Тут просты погляд на магчымасьці таго, чаго нашае грамадзтва дакладна не перажывала, але што гіпатэтычна можа здарыцца пры зьбегу абставінаў. Людзі, хаця б у агульных рысах, мусяць наперад асэнсоўваць свае паводзіны ў верагодных падзеях, каб мець пазыцыю і ведаць што трэба рабіць.

***Зянон Пазьняк***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
*11 – 25 лютага 2007 г.*

# ЮРЫ БЕЛЕНЬКІ: „З БАЛТА-ЧАРНАМОРСКІМ КАЛЕКТАРАМ МЫ НЯ МЕЛІ Б СУР'ЁЗНЫХ ПРАБЛЕМАЎ У ЭНЭРГЕТЫЦЫ"

Дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня, намесьнік старшыні КХП-БНФ Юры Беленькі нагадаў пра варыянт вырашэньня энэргетычнага канфлікту з Расеяй – стварэньне Балта-Чарнаморскага нафтагазавага калектару. Яшчэ напачатку 90-х гадоў гэтае пытаньне было пастаўлена парлямэнцкай Апазыцыяй БНФ.

Беленькі: „Канечне, энэргетычная бясьпека была адным з тых накірункаў, якія лічыліся прыярытэтнымі ў нашай дзейнасьці. І я хачу нагадаць тагачаснае папярэджаньне Зянона Пазьняка, што рана ці позна вось гэтая залежнасьць будзе выкарыстана супраць нас, калі ня будуць зроблены прэвэнтыўныя захады, каб яе пазьбегнуць.

Балта-Чарнаморскі калектар – гэта быў праект тэхнічнага вырашэньня праблемы. Але прапаноўвалася й палітычная канцэпцыя – стварэньне супрацоўніцтва дзяржаў, блізкіх эканамічным патэнцыялам, мэнталітэтам і гісторыяй, гатовых бараніць свае інтарэсы. Рабіць усё гэта супольна было б намнога лягчэй. Вельмі добрая была ідэя. Калі прыйшоў да ўлады Лукашэнка, дык зрабіў так, як сам ён і сказаў: Расеі перадалі ўсё, што яна прасіла. І цяпер вось гэты інструмэнтар выкарыстоўваецца найперш супраць Беларусі. Але ўскосна тое дзейнічае й супраць Лукашэнкі, які цудоўна разумее: забраўшы Беларусь, спэцслужбы ня будуць доўга цырымоніцца й зь ім…

Цяпер варта і трэба ўзнавіць і ўзьняць тыя матэрыялы. Тэхнічная рэалізацыя праекту Балта-Чарнаморскага калектару дастаткова простая. Галоўнае, каб была палітычная воля для яго рэалізацыі.

Праблема на шляху рэалізацыі гэтага праекту паўстала толькі адна: да ўлады ў Беларусі прыйшоў прарасейскі рэжым і, адпаведна, памянёныя

пляны стаў разбураць – не тое каб рэалізоўваць. Канечне, калі б тады ўладу здабылі беларускія сілы, Балта-Чарнаморскі праект быў бы даўно зрэалізаваны і мы ня мелі б такіх сур'ёзных праблемаў, якія маем у галіне энэргетыкі сёньня".

*(Радыё „Свабода" )*

# У ВЕНЕ АБ'ЯВІЎСЯ АПАЗЫЦЫЯНЕР БЕЛАРУСІ І ПРЫХІЛЬНІК МАСКВЫ

9 студзеня 2007 г. Аўстрыйская газэта „Der Standard" пісала пра газавую вайну Расеі супраць Беларусі. Паведамляла, што „Лукашэнка заганяны ў кут". Даволі адэкватна вызначыла палітычныя прычыны нібыта сыравіннага канфлікту: „Пытаньне аб'яднаньня дзвюх дзяржаваў (Беларусі і Расеі) становіцца актуальным, калі Пуцін хоча пайсьці на трэці прэзыдэнцкі тэрмін. Манэўрам з Саюзам ён мог бы дамагчыся гэтага, не парушаючы канстытуцыю". Далей газэта спасылаецца на М. Марыніча, які якраз знаходзіцца ў Аўстрыі. Запрасіў Марыніча аўстрыйскі Інстытут Дунайскага рэгіёну і Цэнтральнай Эўропы ў рамках дасьледчай праграмы, якую вядуць супрацоўнікі Інстытута Ганс-Георг Хайнрых і Людзьміла Лобава.

Венская газэта распавядае пра „гераічны шлях" Марыніча. Як ён быў міністрам па зьнешнегаспадарчых сувязях у Лукашэнкі, потым стаў апазыцыянэрам і вязьням рэжыму, як яго выпусьцілі датэрмінова. Газэта цытуе развaжаньні Марыніча, зь якіх становіцца зразумелым хто і навошта запрасіў яго ў Аўстрыю. Марыніч выказавае падтрымку дзеяньням Расеі супраць Беларусі, якая – цытуем: „села на наркотык таннай энэргіі". Далей „герой-апазыцыянэр" спасылаецца на кіраўніка апазыцыі Мілінкевіча. Кажа, што „прэмія імя Сахарава, уручаная Мілінкевічу, азначае падтрымку ўсяе апазыцыі". Далей Марыніч даволі падрабязна і шчыра расказвае, што ж гэта за апазыцыя такая. Цытуем: „Антырускія атакі не прынясуць карысьці, бо насельніцтва Беларусі масава настроена па-прарасейску. Таму ў апазыцыі ёсьць адзіны шанец, калі яна выступае за супрацоўніцтва з Расеяй. Беларусь мае вялікі патэнцыял гатовых да рэформаў палітыкаў, якія ня будуць праводзіць антырасейскую палітыку. Пры гэтай умове і Масква таксама, нягледзячы на свой аўтарытарны курс, будзе падтрымліваць дэмакратычную зьмену ў суседзяў".

Наш камэнтар: Ну як вам гэты „апазыцыянэр"? Мы бачым чарговую ілюстрацыю з апошняга артыкула Зянона Пазьняка пад тытулам „У чым сутнасьць нафта-газавай вайны паміж рэжымамі Пуціна і Лукашэнкі" (апублікавана на старонцы pbpf.org). Гэта пра такіх напісаў сп. Пазьняк: „Але шмат ёсьць розных „эканамістаў", „юрыстаў" ды „журналістаў", якія камэнтуюць канфлікт, паддакваючы цяпер нашым непрыяцелям расейцам, часам з жаданьня „насаліць" Лукашэнку. З гісторыі, аднак, вядома, што той, хто выступаў за „за поражение своего правительства (краіны) в войне", гаварыў гэта за вялікія нямецкія грошы. Аналёгія вельмі празрыстая датычна некаторых лукашэнкаўскіх „апазыцыянэраў", аматараў езьдзіць у Маскву ды Брусэль". Ды ў Вену – дадамо мы. Запрасілі Марыніча ў Вену „навуковыя супрацоўнікі": яшчэ адзін Ганс-Георг (тут успамінаецца незабыўны „беларусазнаўца" Г.-Г. Вік) і таварищ Людмила Лобова. Немцы вядуць інстытуцкую праграму „па дэмакратызацыі Беларусі праз прарасейскіх палітыкаў" разам з маскоўскімі таварышамі. І вось з гэтай публікай „совешчался о перспектівах белорусской демократіі" герой прарасейскай апазыцыі М. Марыніч. Можа гэта ён „сам па сабе"? Не, Марыніч спасылаецца на аўтарытэт Мілінкевіча і „аб'яднанай апазыцыі".

Чаму ж радыё Свабода не паведаміла нам пра гэты апазыцыйна-прарасейскі візыт Марыніча? Чаму інфармацыю пра сапраўдны зьмест перамоваў гэтых „апазыцыянэраў" мы павінны шукаць у заходніх газэтах? А таму, што дзеяньні гэтых прарасейскіх „апазыцыянэраў" зьяўляюцца клясічным прыкладам нацыянальна-дзяржаўнай здрады.

***Янка Базыль***

# ЯРМОШЫНА ПАХВАЛІЛА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ РЭЖЫМНАЙ ФАЛЬШЫЎКІ

Ярмошына пахваліла групу В. Вячоркі. У разгар чарговай рэжымнай фальшыўкі пад назовам „мясцовыя выбары" 14 студзеня а 15 гадзіне яна зьявілася на БТ і прызналася, што ў Менску назіраецца праблема з кворумам на выбарчых участках, зьявіліся ня больш за 37% выбарцаў. „Всё хорошо только в Мірошніченковском округе століцы, там прішло уже более 50% ізбірателей..." У Мірашнічэнкаўскай акрузе балатаваўся вядомы В. Вячорка. Падпісваўся абрэвіятурай „Партыя БНФ", ягоныя таварышы раскідвалі агіткі па паштовых скрынях пра „незалежнасьць і справядлівасьць". Кандыдат нават даў канцэрт „беларускіх выканаўцаў" на адной з мясцовых пляцовак. Прышчэпленыя да антыбеларускага рэжыму псэўдафронтаўцы, мабыць, здолелі падмануць некаторых людзей. Тыя так зазывалі іх „за справядлівасьць", што многія і пайшлі на выбарчы фарс. Можа Вінцуку цяпер мэдаль дадуць – „За заслугі перед режімом".

Фарс працягнуўся й пасьля „галасаваньня". Нават вялікі А. Лебедько карцінна зьняў сваю кандыдатуру за два дні да 14 студзеня. Вінцук „пайшоў да канца". Нават пасьля ганебных „вынікаў галасаваньня" ён выступіў на радыё Свабода з гнеўнай прамовай: „Я буду дамагацца праз суд выпраўленьня гэтай несправядлівасьці!.." Гэта выглядала так сьмешна і недарэчна, што вінцукова прамова правісела на старонцы Свабоды ўсяго некалькі гадзінаў і зьнікла.

***Валеры Буйвал***

# СТРАТЭГІЯ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ

Нядаўна на старонцы pbpf.org мы камэнтавалі паведамленьні аўстрыйскіх газэтаў пра візыт у Вену „дзеяча беларускай, прамаскоўскай апазыцыі" (як яны называлі яго) Міхаіла Марыніча. Ягоны візыт быў „дзелавым". Разам з аўстрыйскімі немцамі ён распрацоўваў новую „стратэгію для Беларусі". Менавіта так, – „Стратэгія для Беларусі", – і называецца дакумант, шырока распаўсюджаны пасьля працы „рабочай групы" з удзелам Марыніча.

Працытуем фрагмэнты гэтага тэксту ў перакладзе з ангельшчыны:

„Беларусь знаходзіцца ў стане найбольш драматычнага крызісу з часоў абвяшчэньня незалежнасьці. Цяперашняя сістэма выжыла выключна на аснове прамых і апасрэдваных расейскіх субсідыяў і на здольнасьцях цяперашняга лідэра (Лукашэнкі) абменьваць рыторыку на энэргію. ...Для Расеі здольнасьці Лукашэнкі страцілі значэньне, і Масква пачала будаваць свае адносіны з Беларусяй на рынкавых асновах. У Беларусі гэта разглядаюць як закручваньне гаек, але Расея наступае наперад, не надаючы шмат увагі на магчымыя палітычныя наступствы. Гэта таму, што паводле Масквы на сцэне беларускага тэатру проста няма іншых адказных акцёраў..."

Паводле венскіх мудрацоў, Беларусь выжыла не на аснове працы беларускага народу (многія іншыя народы даўно б перасталі працаваць у такіх умовах – расейцы ёсьць прыкладам гэтаму), а на аснове расейскіх субсідыяў. Не Масква на працягу гадоў рабавала і эксплуатавала наш народ, а мы карысталіся энэргетычнай „халявай". Але побач з гэтай размовай цікава глядзіцца прызнаньне факту ўпартай маскоўскай самаўпэўненасьці (якую цалкам падзяляюць венскія спэцы). Акрамя шклоўскага лідэра, яны ня бачаць іншых „акцёраў". Беларускага народу як сілы для іх не існуе.

Цытуем далей: „Лёс Беларусі займае ня толькі Расею, але й Эўразьвяз... Ніхто не зацікаўлены ў калапсе беларускай эканомікі, што адмоўна адбілася б на абодвух баках".

І зноў яны тэарэтызуюць выключна пра сабе самых. Разважаюць пра нашу эканоміку, пра нашу краіну без згадкі пра нашы нацыянальныя інтарэсы. Для іх Беларусь зьяўляецца таварам у трансакцыі „абодвух бакоў".

Але і ў гэтай частцы тэксту мы знаходзім цікавае прызнаньне ў стылі Ганса Віка: „Дыялёг паміж Брусэлем і Масквой, у якім Брусэль гаворыць адным (галоўным чынам нямецкім) голасам...”

Цытуем: „У пэрспэктыве магчымай эканамічнай катастрофы **будучыня Беларусі павінна стаць сумесным эўрапейска-расейскім праектам ...Прыярытэтнымі павінны стаць эканамічныя інтарэсы як Расеі, так і Эўразьвязу...”** (Вось яно як!)

Такім чынам, абяцанка рэформаў на Беларусі грунтуецца на інтарэсах Эўразьвязу і Расеі. Пра беларусаў зь іхнымі інтарэсамі няма нават згадкі. Падобна, што рынкавыя рэформы на нашай зямлі змоўшчыкі зьбіраюцца праводзіць пасьля таго, як беларусаў у Беларусі ўжо не застанецца.

Цытуем: „Другім прырытэтам зьяўляецца трэнінг новай адміністрацыйнай і мэнэджэрскай эліты. Цяперашнія беларускія эліты ствараліся ў адпаведнасьці з крытэрам лаяльнасьці рэжыму і атрымалі свой прафэсійны досьвед пад аўтарытарным рэжымам. Іхная экспэртыза будзе патрэбная на першых кроках да новай сістэмы. Але ў выпадку, калі яны застануцца дамінуючай сілай, то яны будуць паўтараць свой досьвед пры новай сістэме і замацоўваць акасьцянелыя старыя структуры”. Таму „дабрадзеі” прапануюць утварыць трэнігавую інстытуцыю ў аўстрыйскай Адміністрацыйнай Акадэміі, **якая будзе сумесным расейска-эўрапейскім праектам.**

Прапануем папярэдні пасаж асабліва ўважліва прачытаць прадстаўнікам сёньняшняй дзяржаўнай і эканамічнай адміністрацыі Беларусі ўсіх узроўняў. Вамі, спадары беларускія чыноўнікі, у рамках эўра-рускага праекту зьбіраюцца пакарыстацца толькі „на першых кроках”. А потым вас вытураць зь „беларускіх элітаў”. Вашыя месцы зоймуць выхаванцы нейкай трэнінгавай інстытуцыі. Зразумела, што гэта будуць расейцы. Якраз аб гэтым даўно папярэджваюць беларускіх чыноўнікаў беларускія патрыёты – пасьля ліквідацыі беларускага школьніцтва, беларускай мовы і нашай незалежнай дзяржавы ліквідатары маюць намер ліквідаваць і беларускае чынавенства, і беларускіх спэцыялістаў, бо „акасьцянелыя і старыя” і г. д.

Але гэта была толькі ўвэрцюра маскоўскай „Хаванщчыны”. У разьдзеле „Эканамічная стратэгія” антыбеларускі цынізм венскіх дабрадзеяў раскрываецца напоўніцу: „Пасьля распаду Савецкага Саюзу Расея субсідыравала Беларусь мільярдамі даляраў і цяпер яшчэ расьце гэты доўг. (На справе ўсё наадварот – *Я.Б.*). Для Эўропы Беларусь не зьяўляецца прыярытэтнай вобласьцю. Яна ўспрымаецца як малая і стабільная краіна, эканоміка якой неадрыўна зьвязана з Расеяй. Інтарэсы Эўропы сфакусаваныя на наступствах пашырэньня і падрыхтоўцы далейшага пашырэньня Эўразьвязу на Паўднёвы Усход. Так што адсутнасьць працэсаў набліжэньня Беларусі да Эўропы не зьяўляецца вялікай стратай для Эўропы. Эўропа можа пачакаць, пакуль сістэма будзе зьменена знутры. Адзінымі краінамі Эўразьвязу, якія зацікаўлены не дапусьціць увядзеньня эканамічнага эмбарга супраць Беларусі, зьяўляюцца Польшча і суседнія зь Беларусяй краіны, якія маюць зь ёю інтэнсіўны гандаль”. Далей распрацоўшчыкі эўра-рускай стратэгіі прызнаюцца, што Беларусь цікавая для іх толькі як „важны транзітны калідор забесьпячэньня Эўропы энэргіяй”.

Дзякуй палякам, украінцам і прыбалтам. Нават ворагі вымушаны прызнаць, што нашы суседзі (зразумела, што не Расея) аказваюць нам падтрымку на міжнароднай арэне. Але трэба прызнаць, што пад размовы пра дэмакратыю на гэтай арэне пануе дзікі каляніялісцкі інтэрас. Паводле шчыраваньняў „эўрастратэгаў” зразумела, што яны нічым не адрозьніваюцца ад крамлёўска-лубянскіх „дэмакратаў”.

У разьдзеле „Інвэстыцыі і крэдыты” мы чытаем: „Ізаляцыя, якую сама на сабе накінула Беларусь, драматычна падарвала сітуацыю”.

Аказваецца, гэта не расейская агрэсія і антыбеларуская палітыка прамаскоўскага рэжыму, не маніякальная арыентацыя на расейскую імпэрыю ва ўсім, не шалёная русіфікацыя і пагром усяго беларускага ў Беларусі, не ўвядзеньне для беларускіх грамадзянаў рэжыму ізаляцыі з боку Захаду прывялі да падрыву сітуацыі. Гэта беларусы самы „накінулі” на сабе ізаляцыю... Далей па тэксьце эўраспэцы абяцаюць крэдыты без „шокавай тэрапіі” і г.д. Але якія могуць быць крэдыты ад такой фальшывай публікі?

Аднак пік цынічных развважаньняў аб нашым лёсе дасягнуты „стратэгамі” у разьдзеле „Палітычныя рэформы”. Вось галоўныя пункты іхняй палітстратэгіі: „Зьліцьцё апазыцыйных групаў, якія разьяднаныя цяпер, у адну кааліцыю дэмакратычных сілаў на базе праграмы рэформаў. Круглы стол паміж прадстаўнікамі ўраду і апазыцыі па дэмакратычных і эканамічных рэформах”. Цяпер чытайце уважліва – „Пытаньне пэрсанальнага лідэрства павінна быць узьнята на адным з этапаў гэтага працэсу, але ўздымаць яго трэба толькі пасьля ўсталяваньня праграмнага базісу”.

Немцы ў каторы раз „аб’ядноўваюць” тут усіх „апазыцыянэраў” і заклікаюць іх да круглага стала з рэжымам. Дык гэта ўжо было, і колькі разоў зь незабыўным эўрастратэгам Гансам Вікам і пасьля яго. Лебедько, Вячорка і шэраг іншых „аб’яднаных” на працягу цэлага году вялі такія „перамовы” з прадстаўнікамі Лукашэнкі за круглым сталом у піўным рэстаране „Ракаўскі бровар” у Менску (1999-2000 гг.). Менавіта тады Ганс Вік (камісар ад АБСЭ) арганізоўваў у Менску кааліцыю з „аб’яднанай апазыцыі” (пазьней ён публічна прызнаўся, што рабіў гэта з санкцыі КГБ РБ). Вынікі гэтай „кааліцыі” і гэтага „стала” мы бачым цяпер. А немцы „нічтоже сумняшеся” зноў прапануюць тым жа самым дзеячам ісьці па той жа дарожцы. Толькі ні-ні, не абірайце сабе пэрсанальнага лідэра. Яго (акцэптабельнага як на Захадзе, так і ў Маскве) падбяруць за вас нямецкія эўрастратэгі.

Чытаем разьдзел далей: „Гэта адлюстроўвае „эўрапейскія” базавыя каштоўнасьці. А што тычыцца расейскіх прыярытэтаў, то **праграма рэформаў павінна безумоўна адлюстроўваць той факт, што новыя кіруючыя эліты будуць захоўваць расейскія стратэгічныя інтарэсы, а таксама што праэўрапейская пазіцыя ў Беларусі цалкам супадае са спэцыяльнымі адносінамі з Расеяй. Пакуль Расея будзе давяраць „прарасейскасьці” кіруючых элітаў у краінах, якія складаюць стратэгічны пояс вакол яе, датуль палітычныя і эканамічныя рэформы або шчыльныя адносіны з эўрапейскімі рынкамі ня будуць нікога раздражняць.** Што тычыцца Беларусі, то гэта пытаньне расейскіх абарончых аб’ектаў на беларускай тэрыторыі, якія нельга перавесьці альбо выдаліць ў кароткі прамежак часу альбо без недапушчальных стратаў.”

Ну, як вам? Ці не запахла ў паветры Мюнхэнам 1938-га года? Такой тады была лексіка, такім быў праект эўрастратэгаў Чамбэрлена, Гітлера і Мусаліні, калі дэмакратычны Захад аддаваў Чэхаславаччыну фашыстоўскаму драпежніку. Захад спадзяваўся адкупіцца ад агрэсара адной краінай і жыць спакойна ды карыстацца „чэхаславацкім калідорам”. Да чаго гэта прывяло, мы добра ведаем.

У фінальнай частцы сваёй „Стратэгіі” немцы расказваюць, як АБСЭ, міністэрства замежных справаў Аўстрыі і асабліва дэлегацыя Нямеччыны пры АБСЭ будуць арганізоўваць у Беларусі эканамічныя форумы з мэтай „паступовага адкрыцьця беларускай эканомікі праз руска-эўрапейскія сумесныя прадпрыемствы, як зноў дадуць грошы няўрадавым арганізацыям (фондам і фондзікам) ды навучаць двух (!) студэнтаў з РБ.

Дакумант датаваны 15 сьнежня 2006 г. і падпісаны ў Вене наступнымі „стратэгамі”:

Людзьміла Лобова

Ганс-Георг Гайнрых

Кірыл Коктыш

Міхаіл Марыніч

„Стратэгію” разаслалі па розных эўрапейскіх структурах і асобах у тым ліку Вацлаву Гавэлу, ад якога хочуць атрымаць падтрымку. Праект „стратэгіі супраць Беларусі” фінансаваны Аўстрыйскім Нацыянальным Банкам.

Калі згаданых грамадзянаў РБ К. Коктыша і М. Марыніча будуць судзіць у вызваленай ад дыктатуры Беларусі за нацыянальную здраду і дзеяньне супраць нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў Айчыны, падсудныя будуць лемантаваць. Яны скажуць, што гэта не яны, а немцы распрацавалі гэтую антыбеларускую стратэгію, што ім далі тэкст і яны падпісалі яго, не прачытаўшы. І самае кур’ёзнае, што яны па факце (цалкам верагодна) будуць казаць суду праўду. Нявыключана, што Марыніч і іжэ зь ім проста падмахнулі „стратэгію”, распрацаваную нямецкім ворагам Беларусі ў згодзе з маскоўскім зьнішчальнікам нашай краіны. Яны падпісалі б любы тэксьцік – абы іх прызналі „акцэптабэльнымі” ды дапусьцілі ў „новую эліту”.

Але чаму Вена, а не Бэрлін? А такі вось, відаць, дыпляматычны хітрык. Ня ўсё ж публічна падстаўляцца пані Мэркель ды іншым гансвікам. Яны камфортна пакарысталіся германскімі суродзічамі з нэўтральнай Аўстрыі. Але нам ад гэтага не лягчэй.

Як бачым, нямецкі эстэблішмэнт Эўразьвязу, Масква і „апазыцыянеры"-марынічы нават ня згадваюць пра беларускі народ, ягонае права на нармальнае жыцьцё на сваёй зямлі і ў сваёй дзяржаве. Такімі шчырымі ў сваіх антыбеларускіх памкненьнях не былі нават бальшавікі. Што ж рабіць нам у гэтай, здавалася б невыноснай сітуацыі варожага атачэньня з Захаду і Усходу? Па-першае, ня трэба ўпадаць у адчай. Мы – ня першы народ, які рабаўнікі-хаўрусьнікі падзялілі паміж сабой і вырашылі эксплуатаваць яго да поўнага зьнішчэньня. І такая сітуацыя ў нашай гісторыі ўзьнікае не ўпершыню.

Беларуская стратэгія самаабароны павінна быць адэкватнай. Гэта – Беларуская Салідарнасьць усіх людзей, для якіх Беларусь – дарагая Айчына, а не прадмет для акцэптабэльнага гандлю. Наш народ павінен урэшце падаць свой голас, ад якога здрыгануліся б хаўрусныя ворагі, і пагнаць са сваёй зямлі здраднікаў – усіх гэтых цынікаў, што навучыліся зарабляць на апазыцыі і дыктатуры, усіх разам з прамаскоўскай хеўрай і „стратэгамі" з Масквы-Бэрліну.

У абароне Бацькаўшчыны гуртуймася пад Сьвятым Бел-Чырвона-Белым Сьцягам!

***Янка Базыль***

*(„ Мы ёсьць беларуская народная партыя")*

# ЛЮТАЎСКІ СОЙМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ „АДРАДЖЭНЬНЕ" І КАНСЭРВАТЫЎНА-ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ПАРТЫІ – БНФ

11 лютага сёлета ў Менску адбыўся чарговы Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Сойм заслухаў даклад сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ, – „Пагроза для Беларусі" (публікуецца). З дакладамі па палітычнаму і сацыяльна-эканамічнаму становішчу ў Беларусі і па-за яе межамі выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў у Беларусі старшыні Фронту і Партыі, а таксама сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі.



*Галіна Пазьняк.*

Беларускім патрыятычным сілам удалося сарваць падступны плян Масквы, а менавіта не дапусьціць правядзеньне ў студзені 2007 г. антыканстытуцыйнага рэфэрэндуму па „інтэграцыі" Беларусі ў Расею. Асьветніцкая праца па ўсёй краіне, супрацьдзеяньне патрыётаў антыбеларускаму рэжыму і прамаскоўскай апазыцыі, якія цягнулі людзей на фальшывыя мясцовыя выбары, – у чарговы раз не дазволілі антыбеларускім колам зьдзейсьніць пляны разбурэньня Беларускай дзяржавы. У выніку ў лягеры прарасейскай псэўдаапазыцыі пачалася шумная кампанія „ратацыі лідэра дэмсілаў" і „пагадненьня з Лукашэнкам", што дэманструе сапраўдную сутнасьць псэўдаапазыцыйнай зьявы. А паміж Масквой і Менскам пачалося „высьвятленьне адносінаў".

З набліжэньнем прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі актывізуецца ня толькі групоўка Пуціна, але назіраюцца таксама спробы кансалідацыі непадпарадкаваных непасрэдна Пуціну і Лубянцы колаў дзеля захопу ўлады ў Расеі. Гэта ня толькі Зюганаў і ягоныя камуністы. Вядома, што значная частка расейскага генэралітэту і афіцэрскага корпусу незадаволена дыктатурай гэбістаў. Менавіта яны хацелі б правесьці новы „перадзел" маёмасьці ў імпэрыі. Яны імкнуцца абаперціся на шырокія масы насельніцтва Расеі, на мільёны абрабаваных імпэрскім рэжымам людзей, якія ўжо разуверыліся ў „пуцінскай дэмакратыі" і ў „новых рускіх". Але абедзьве палітычныя тэндэнцыі ў Расеі аднолькава імпэрскія і аднолькава варожыя незалежнай Беларусі, цывілізаванаму разьвіцьцю нашага народу. Беларусам трэба не дапусьціць, каб усходняя імпэрыя ўцягнула нас у свой крывавы разлом. Няхай імпэрцы разьбіраюцца між сабой самы. Даносіць да нашых людзей праўду аб працэсах, што адбываюцца ў Расеі, аб неабходнасьці ісьці дэмакратычным шляхам незалежнай эўрапейскай дзяржавы, абараняць сваю мову і культуру – гэта застаецца галоўнай задачай патрыётаў-франтоўцаў.

Выступілі таксама сябры Сойму з розных рэгіёнаў краіны. Пасьля фальшывых мясцовых выбараў (на якіх дыктатура правяліла амаль усіх кандыдатаў псэўдаапазыцыі) псэўдаапазыцыянэры распавядаюць у мясцовай прэсе аб тым, як яны падчас выбарчай кампаніі абышлі тысячы кватэраў, як заклікалі людзей ісьці на выбарчыя ўчасткі. Яны прызнаюцца нават, што без іхнай „прапаганды за выбары" рэжыму не ўдалося б правесьці выбарчы спэктакль. Такім чынам, людзі яшчэ раз пераканаліся, чым інтарэсам служаць гэтыя „дзеячы". Па ўсёй краіне рэжым працягвае разбурэньне і зацісканьне ўсяго беларускага. Працягваецца шалёная кампанія русіфікацыі школьніцтва і ўсіх сфэраў публічнага жыцьця, гарады запаўняюцца расейскімі асаднікамі, якія скупляюць беларускую маёмасьць, займаюць кіруючыя пасады і лепшыя кварталы. Адказам на паўзучую акупацыю нашай краіны павінна быць усенародная Беларуская Салідарнасьць.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*11 лютага 2007 г.*

# БЕЛАРУСЬ У СЭРЦЫ

*(Урывак з успамінаў)*

### *Беларускае дзяцінства*

Дзівосная пара майго дзяцінства прайшла на Лагойшчыне. Майго бацьку, Палачаніна Фёдара Сьцяпанавіча, кожныя год-два перакідвалі зь вёскі ў вёску дырэктарам школы – пасьля вайны доўга яшчэ не хапала „кадраў".

Найлепш памятаю вёску Крэмянец, дзе ў 1959 годзе я пайшла ў школу, і вёску Моладзі, якая знаходзілася ўсяго за 10 кілёмэтраў ад Лагойску, але электрычнасьці ў вёсцы яшчэ не было (1960-62 гг.), і я рыхтавалася да заняткаў пры сьвятле керасінавай лямпы.

Мне было ўжо гадоў дзесяць, і мы з мамай у нядзелю калі-нікалі хадзілі ў Лагойск на кірмаш. Аўтобусы тады ніякія не хадзілі, „папуткі" у нядзелю здараліся рэдка, і мы ішлі пехатой 10 *км* туды і 10 *км* назад, несучы яшчэ і „куплёнае".

У маім дзяцінстве вялікую ролю адыгрывала радыё. Некаторыя радыё-казкі, радыё-пастаноўкі памятаю дагэтуль. Тэлебачаньня на вёсцы яшчэ не было, але мы не былі абдзеленыя. Радыё было зьмястоўным і цікавым, і мы з задавальненьнем слухалі любімыя перадачы. Радыё ўплывала на нас, дзяцей, і сапраўды выхоўвала.

* * *

Заняткі ў пачатковай вясковай школе праходзілі не асобна для кожнага кляса, а былі спараныя. У адным пакоі адначасна вучыліся дзеці 1-га і 3-га

клясаў, у другім за чорнымі партамі сядзелі вучні 2-га і 4-га клясаў. Дзяцей рассаджвалі па два бакі пакоя. З аднаго боку сядзелі першаклясьнікі, з другога – трэцьцяклясьнікі; зьлева другі кляс, справа – чацьверты.

Лекцыя дзялілася на дзьве часткі. Спачатку настаўніца працавала з адной паловай вучняў (напрыклад, 4-ы кляс, матэматыка): правярала хатняе заданьне, тлумачыла. Другая ж частка (2-гі кляс) выконвала пісьмовыя заданьні (родная мова, маляваньне і г.д.). З паловы лекцыі „дэкарацыі" мяняліся. Настаўніца працавала ўжо з 2-м клясам, а 4-клясьнікі выконвалі пісьмовыя заданьні.

Сёньня здаецца, што ў такіх умовах ніякага „працэсу адукацыі" быць ня можа. А вось жа было! І дзеці слухаліся настаўнікаў, і вучыліся. Ня памятаю, каб былі нейкія вялікія праблемы з „паводзінамі" вучняў на занятках. Ды і сама пасада настаўніка на вёсцы была ў вялікай пашане. „Вучоны чалавек" – казалі пра яго. Слова настаўніка было для бацькоў законам. Ды і самы вясковыя настаўнікі былі добрымі і сардэчнымі. Засталася ў памяці з тых далёкіх вясковых часоў нейкая агульная настаўніцкая дабрыня, чаго ўжо не магу сказаць пра гарадзкую (менскую) школу і яе настаўнікаў, дзе я вучылася з 1962 года.

Мілая сэрцу беларуская вёска. І Моладзі, што на Лагойшчыне, і Ліпск на Бягомельшчыне. Гэта ўсё маё, роднае, беларускае. Мая памяць захоўвае басаногае дзяцінства і сьцюдзёную мякаць роднай верасьнёўскай зямлі, чырвонае сонца над зімовымі вечаровымі хатамі, хваёвы лес, сон-траву, грыбы (смарчкі, рыжыкі, баравікі), суніцы, чарніцы ды брусьніцы, якіх так шмат было ў нашых багатых беларускіх лясах.

Усім лепшым, што ёсьць у маёй душы, я абавязана маме і табе, беларуская прырода. Люблю нашыя лясы, палі, сенажаці, сады і агароды, усю вясковую жыўнасьць (коней, каровак, гусей, курэй ды качак). Усё гэта любіла мама і перадавала мне гэтую сваю любоў, шкадуючы кожную зламаную галінку, радуючыся вясёлцы і дажджу, краскам у полі і знойдзенаму баравіку ў лесе.

Увогуле, мне здаецца, што добрае сэрца можна ўзгадаваць толькі на вёсцы, сярод усяго нашага прыроднага багацьця, харaства і людзкой дабрыні. Добры, гарманічны, не разбэшчаны чалавек можа ўзрасьці толькі сярод прыроды, на вёсцы. Горад абавязкова чаго-небудзь не дадасьць.

Мая мама (Маргарыта Ермалаеўна), настаўніца старэйшых клясаў, выкладала беларускую, рускую і нават нямецкую мовы (не хапала спэцыялістаў). Бацька быў дырэктарам школы, але выкладаў яшчэ матэматыку, гісторыю, геаграфію і нават маляваньне.

На сьвяты ў клюбе адбываліся канцэрты настаўніцкай (і вясковай) мастацкай самадзейнасьці. Сьпявалі беларускія песьні, чыталі вершы, ставіліся спэктаклі. І хоць рэпэртуар быў у асноўным свой, беларускі (а як жа ж), відаць, нейкі працэнт „рускага" быў абавязковым. З гэтых канцэртаў памятаю, як мама чытала са сцэны „Рускі характар" А. Талстога.

Аднаго разу канцэрт вёў дырэктар школы і аб'явіў байку Крылова „Дзям'янава вуха" (бо хто там чуў калі рускае слова „уха" з націскам на „а"). Некалі гэта выклікала ў мяне сьмех. А зараз я думаю, што ніякай бяды, што дырэктар ня ведаў таго Крылова, не было. Ён добра ведаў сваё, беларускае, і шмат чаго яшчэ. А гэта, на маю думку, значна лепш, чым ведаць чужое, ня ведаючы свайго.

Так склалася, што ў 1962 годзе мы з мамай вырашылі пераехаць у Менск, і пачалося зусім іншае жыцьцё.

Каб пераехаць у горад, патрэбна была прапіска, атрымаць якую ў міліцыі было немагчыма. Мама мусіла знайсьці сям'ю „сваякоў", у якой было б „лішніх" *12 м²* жытла.

За савецкім часам мінімум квадратнай „карыснай" (значыць, „жылой") плошчы жытла на чалавека ў Менску быў *6 м²* (у некаторых раёнах яшчэ менш). Калі сям'я з трох чалавек жыла ў кватэры, скажам, *18,06 м²*, то *0,06 м²* былі „лішняй плошчай", і стаць на кватэрную чаргу на „расшырэньне" было немагчыма. Толькі калі, скажам, нараджалася 2-е дзіця, сям'я ўпісвалася ў 10-15-гадовую чаргу чаканьня. Так і жылі-мучыліся бяспраўныя людзі. Рынку нерухомасьці ў СССР не існавала, і таму купіць ці пабудаваць кватэру ў горадзе было немагчыма.

Маме пашанцавала. Знайшлася сям'я (адна з тысячы) ў прыватным доме, у якой аказалася „лішняя плошча" і якая пагадзілася яе прапісаць. На гэта патрэбны былі грошы. І мама прадала сваё адзінае кітайскае паліто (новае, яшчэ з этыкеткай). Я моцна перажывала і плакала, бо паліто маме вельмі пасавала, яна ў ім была такая стройная і прыгожая.

Удваіх з мамай мы пераехалі ў Менск, знайшлі маленькую кватэру ў добрых людзей у прыватным доме на вуліцы Брылеўскай. Наш пакойчык быў вельмі малы. У ім стаяў аднаспальны жалезны ложак (на якім мы спалі з мамай удваіх, падставіўшы дзьве табурэткі) і стол. Але гаспадары былі вельмі добрыя. Мы сталі блізкімі сябрамі, і гэтае сяброўства доўжыцца ўжо 43 гады. Нават дачка носіць імя нашай добрай гаспадыні цёці Надзі (Нівядовіч), надзвычай сардэчнай і шчырай.

Бліжэйшая ад нас школа (№1) знаходзілася на вуліцы Чкалава. Туды я і пайшла вучыцца ў 4 кляс з пачатку навучальнага году. Мама ж уладкавалася на працу выхавацельніцай у „спэц" школу-інтэрнат №8 для дзяцей з запозьненым разумовым разьвіцьцём. Прыроджаны філёляг, яна ахвяравалася любімай працай (выкладаньня мовы і літаратуры) і пайшла працаваць выхавацелькай з „цяжкімі" дзецьмі. Трэба было выжываць, а ў такіх „спэц" навучальных установах зарплата на 25 адсоткаў была вышэй, чым у агульнаадукацыйных.

Увогуле, інтэрнаты-васьмігодкі тады былі агульнаадукацыйныя (для дзяцей з малазабясьпечаных ці няпоўных сем'яў) і спэцыялізаваныя („спэц"), з пэўным ухілам (мастацкім, матэматычным і г.д.). Існавалі яшчэ „спэц" інтэрнаты для дзяцей з фізічнымі і разумовымі адхіленьнямі („разумова адсталыя" дзеці). У апошнія накіроўвала спэцыяльная педагагічная камісія.

Паколькі сярод педагагічных чыноўнікаў, якія „засядалі" ў такіх камісіях, часцей траплялі раўнадушныя служкі камуністычнага рэжыму, разьмеркаваньне дзяцей у „спэц" інтэрнат нярэдка адбывалася па фармальных паказчыках. „Двоечнік", „другагоднік", „дрэнны па паводзінах" – значыць „недаразьвіты". Пад агульны грэбень пападалі і дзеці запушчаныя, недагледжаныя, з так званых „праблемных" сем'яў і г.д. (Бацькі алькаголікі, напрыклад, і не пратэставалі такому рашэньню „камісіі".)

Так недагледжаныя (але зусім „нармальныя") дзеці запісваліся дарослымі „пэдагогамі" ў „недаразьвітыя". Некаторыя зь іх былі так званымі „выхаванцамі вуліцы", бацькі якіх былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў.

У такія інтэрнаты нярэдка траплялі і дзеці, якія перахварэлі поліэмілітам і ў выніку хваробы – з рознымі фізічнымі недахопамі.

Усе гэтыя дзеці (разам з сапраўды разумова адсталымі) вучыліся па вельмі спрошчанай праграме (некаторыя прадметы, як алгебра, фізіка, хімія, замежная мова і т.п.) не выкладаліся. Асноўная ўвага – працоўнае выхаваньне. А такая спрошчаная праграма патрэбна была толькі частцы дзяцей. Інтэлектуальна дзеці тут амаль не разьвіваліся.

Мама заўсёды, калі ў яе інтэрнат па недагляду псэўдапедагогаў траплялі „нармальныя" дзеці, вельмі шкадавала іх, цяжка перажывала і актыўна супрацiўлялася на ўсялякую несправядлівасьць, ня раз спрабавала дамагчыся перагляду „справы" некаторых сваіх выхаванцаў, якія трапілі ў інтэрнат для „адсталых" дзяцей. Але яе перажываньні школьную адміністрацыю звычайна не цікавілі. (На педагагічныя пасады, як правіла, траплялі людзі паслухмяныя начальству зьверху.) Якая магла быць крытыка школьнага кіраўніцтва ў савецкія часы?! Пры саветах начальства „не памылялася" – так было ўсюды, тым больш у закасьцянелай савецкімі догмамі школе. І калі дзіця па недагляду трапляла ў такую ўстанову, вырваць яго адтуль, практычна, было немагчыма: „начальнікі" свае рашэньні не адмянялі. Пры камуністах усё ў школе (ды і ва ўсёй адукацыі) было падпарадкавана выхаваньню „сапраўднага будаўніка камунізму" (а зусім не „гарманічнага чалавека", як дэкляравалася).

Шэрасьць, раўнадушша і падпарадкаваньне „агульнай статэгіі" – асноўныя рысы савецкай школы. Выключэньні былі, але яны не адмянялі „правілы". Траплялiся і добрыя настаўнікі, але начальнікі адукацыі, прайшоўшы сіта на адданасьць „кампартыі" – не.

Мама і была такім выключэньнем. Яна старалася разьвіваць эстэтычна сваіх выхаванцаў: вазіла іх на экскурсіі, ці ў парк (на прыроду), бясконца прыдумвала і расказвала ім розныя „гісторыі", уплываючы на ўяўленьні дзяцей. Яна казала мне, што гэтыя дзеці, якія б яны ні былі, вырастуць і пойдуць у жыцьцё. Яны будуць жыць побач з намі, і зараз ад нас залежыць,



(Фота Д. Зянковіча)

*Нёман каля Любчы.*

каб будучае нашае агульнае (грамадзкае) жыцьцё было добрым, каб злых людзей было як мага меней.

Жылося цяжка. Мама з раніцы да позьняга вечара была на працы, бывалі і начныя дзяжурствы. Пасьля школы я ішла да яе ў інтэрнат, і мама дзяліла свой „службовы" абед са мной, аддаючы большую частку мне.

Калі-нікалі я абедала ў рабочай сталоўцы (на вуліцы Чкалава, побач з мастом). Там у 60-я гады на сталах заўсёды стаяў хлеб, соль і гарчыца – ужо з голаду не памрэш. Суп каштаваў 6-11 капеек, катлета з гарнірам 33 капейкі і кампот 5 капеек. Вось я і камбінавала з тых 50-ці капеек, што давала мама на абед, каб „выкраіць" на якія-небудзь прысмакі (цукеркі „падушачкі" – 10 капеек за 100 грам і г.д.).

Каб купіць нейкую адзежу, існавалі ня толькі крамы з новым адзеньнем, а яшчэ камісійныя і так званыя „скупкі". У камісійных былі рэчы лепшыя, але даражэйшыя. Таму доўгі час мы апраналіся ў самай таннай краме – „скупцы". Мама пазнаёмілася з прадаўшчыцай, і яна пакідала нам больш-менш добрыя рэчы коштам да 10 рублёў (некаторыя з тых рэчаў я памятаю дагэтуль).

Жылі бедна. Але не ад гэтага шчыміць сэрца. Былі кнігі, вершы, сябры, былі мары пра лепшую (і багацейшую) будучыню, якія падтрымлівала і разьвівала ў маёй дзіцячай душы мама.

У канцы месяца (перад мамінай зарплатай) амаль ніколі не заставалася грошай. Тады мама казала мне: „Не сумуй, дачушка, у нас яшчэ мільёны незаробленых грошай!" І калі гэта была нядзеля, яна пазычала рублёў 10, мы ішлі ў тэатр, кіно, у парк. І нам было добра.

Зусім іншае – была менская школа. Успамінаючы яе, у мяне дагэтуль непрыемна сьціскаецца душа. Я хадзіла ў школу, як на пакуту. Пасьля маёй вясковай школы, да якой я мела давер і вучылася добра і з ахвотай, менская школа падалася мне нечым жудасным. Мой „деревенский акцент" (гэта значыць – беларуская мова) выклікаў раздражэньне гарадзкіх настаўнікаў, асабліва настаўніцы рускай мовы, якая мела найбольшы ўплыў і вагу, бо рускай мовы і літаратуры было 8 гадзінаў на тыдзень, беларускай жа – толькі тры. З гэтай настаўніцай прыходзілася сутыкацца кожны дзень. Я адчувала яе дрэнныя адносіны, нярэдка гублялася. Калі яна павышала голас, я наогул не магла вымавіць і слова. Таму ў школьным маім дзёньніку пачалі зьяўляцца тлустыя „двойкі".

Каб іх ня ўбачыла мама, пасьля школы я хавалася за бярвеньні і дровы, якія ляжалі ў двары прыватнага дома, дзе мы жылі (ў доме было пячное атапленьне) і чакала, пакуль мама пойдзе ў інтэрнат на працу. Потым я выдзірала з дзёньніка старонку з „двойкай" – і ўсё да пары было ціха.

Праз паўтары гады за вёскай Пятроўшчына (што на поўдні ад Менску), у полі пабудавалі дзьве новыя школы-інтэрнаты (агульнаадукацыйную і „спэц") і дом для настаўнікаў. Маме выдзелілі службовую аднапакаёўку (значыць, жывеш, пакуль працуеш на гэтай працы). Туды пусьцілі гарадзкі аўтобус №41, які курсаваў адзін на маршруце, бо абслугоўваў, фактычна, адзіны трохпавярховы дом для настаўнікаў. Пераехалі мы зімой, і да канца навучальнага году я езьдзіла ў школу №1 на аўтобусе, каб скончыць 5-й кляс. Так я аказалася адарваная і ад горада, і ад роднай вёскі, дзе было шмат сяброў-аднагодкаў.

У сваёй новай „гарадзкой" кватэры мы з мамай спачатку спалі на падлозе на нашай вясковай пярыне. Але гэта быў наш дом, і мы былі шчаслівыя. Паступова куплялася мэбля ў крэдыт (інакш нешта набыць у дом мы не маглі: „лішніх" самых мінімальных грошай, каб нешта купіць, не было ніколі).

Паўднёвая частка Менска (вул. Уманская) шчыльна падбіралася да вёскі Пятроўшчына, якая была ўжо менш за кілёмэтр ад горада. Зусім побач з вялікім горадам беларусы жылі сялянскім жыцьцём, мелі сваю гаспадарку, кароў-сьвіньней. Яшчэ некалькі год мы куплялі ў іх каровіна малачко.

Вёска Пятроўшчына цягнулася ўпоперак вузкай старой „берасьцейскай" дарогі (ці „Дзяржынскай шашы"), якая перад Менскам „пераразала" Пятроўшчыну. Пазьней (да алімпіяды-80) пабудавалі новую дарогу, а ста-

рая (уздоўж могілак) паступова зьнікла. (Сучаснай аўтазапраўкі таксама яшчэ не было.)

З аднаго боку дарогі за вёскай былі могілкі і поле. На другім баку ад шашы – была гарадзкая звалка (зараз на яе месцы стаіць мікра-раён „Паўднёвы Захад"). У полі (дзе зараз 9-ы гарадзкі шпіталь і прыбудовы), у паўкілёмэтры ад шашы – якраз і стаялі гэтыя тры дамы: інтэрнаты і настаўніцкі дом. Летам на полі каласілася жыта. Ад інтэрнатаў пад простым вуглом (адносна шашы) ішла дарожка на аўтобус. Удзень (каб не чакаць аўтобуса) ў горад ісьці можна было пешшу, напрасткі, па сьцежцы ў жыце, праз Пятроўшчыну. Ідучы па гэтай сьцежцы, я зноў адчувала сябе ўдома, на вёсцы, на Лагойшчыне...

Канцовы прыпынак 41-га гарадзкога аўтобуса знаходзіўся наўзбоч шашы. Аўтобус хадзіў вельмі рэдка, як папала, без раскладу. У „коле" ён звычайна стаяў хвілінаў 10.

Бывала, бяжыш ад інтэрната на прыпынак, каб пасьпець – і не пасьпееш. Аўтобус амаль перад самым носам „заводзіцца" і зьнікае. Тады ўжо трэба чакаць ня менш гадзіны, калі гэты аўтобус вернецца назад.

Як жа залез „у пячонкі" мне гэты „сорак першы" зь вечнымі чаканьнямі па 40-60 хвілінаў! Аднаго разу мне прысьніўся сон, што па нейкай новай дарозе (!) ідзе тралейбус, а на месцы звалкі – шматпавярховыя дамы. Я прачнулася з адчуваньнем шчасьця, але праз хвіліну-другую толькі хмыкнула, бо не магла паверыць, што такое калі-небудзь можа стацца і я змагу дабірацца дамоў, не чакаючы на прыпынку адзінага „41-га" па гадзіне. Але праз нейкіх 5-8 гадоў тут пачалася будоўля, вырас вялікі раён, куды сталі хадзіць тралейбусы.

Зь дзяцей у нашым доме была толькі Вера і яе старэйшы брат Гена. Яны былі не тутэйшыя. Маці Веры, Тевризова Нина Григорьевна, была руская, з-пад Казані, але яе муж, зь якім яна пазнаёмілася на вайне, быў беларус зь Менску. У яго быў прыватны дом на Грушаўцы. І хоць маці Веры пасьля вайны разьвялася з мужам, пасьля яго сьмерці яна з двума дзецьмі з-пад Казані пераехала ў Менск. Пераехаць і прапісацца ў Менску для іх сталася магчымым, бо дзеці мелі правы на частку дома памерлага бацькі, а пераехалі яны (як потым расказвалі) ў Беларусь, бо сярод працавітых беларусаў жылося лепш і ніхто не галадаў (у параўнаньні Расеяй, зь яе „хранічнай галоднай хваробай").

Вера была старэйшая за мяне на два гады і для яе гэтая розьніца была істотнай, таму лічыла сябе ў дружбе больш „важнай". Быць „меншай" мне было ня надта камфортна, а часам крыўдна, але, акрамя Веры, дружыць мне не было зь кім. Пасьля заняткаў у гарадзкой школе я ехала ў сваю „Пятроўшчыну" (хвілінаў 40 на аўтобусе).

Уставаць прыходзілася вельмі рана, каб за гадзіну да заняткаў ужо стаяць на прыпынку аўтобуса. Бывала выйдзем мы зь Верай з дому ў завею, пройдзем за агароджаную тэрыторыю інтэрнатаў у поле, і так ня хочацца ісьці на аўтобус у ненавісную школу. Глянем адна на другую і, не згаворваючыся, задаволеныя паварочваем бягом дадому. (Маўляў, мамы ўсяроўна ў інтэрнаце на дзяжурстве. Прыдуць – скажам, што з-за завеі аўтобус не хадзіў.)

У нас дома заўсёды былі кнігі. Аднаго разу я кажу Веры: „Давай вернемся дадому. У нас ёсьць кніжка нейкага Мапасана. Мама мне забараніла яе чытаць. Пакуль яе няма, давай пачытаем. Ну чыталі мы, чыталі, і ніяк не маглі зразумець, чаму яе нельга чытаць. Так ішлі мае школьныя гады.

* * *

У шкльным вучэбным пляне савецкай школы была графа „паводзіны". Такім чынам кожны вучань быў ацэнены клясным кіраўніком. Як правіла, здольныя вучні былі альбо паслухмянымі (з „пяцёркай" па паводзінах) альбо „непаседы", „парушальнікі дысцыпліны". Настаўнікі такіх не любілі, бо яны прыносілі „клопаты". „Паслухмяных", як правіла, не любілі дзеці, сьмяяліся зь іх і былі радыя, калі ў „выдатнікаў" здараліся непрыемнасьці ў школе.

Ня лепшая сітуацыя была і з так званымі „цяжкімі" ці „дрэннымі" вучнямі (гэта значыць, менш здольнымі). Калі тыя ня слухалі, „круціліся" на занятках, нечага ня ведалі, настаўнікі нярэдка іх зьняважалі (называлі „дурак", „придурак", „идиот" і г.д.), крычалі, выганялі з кляса. Потым гэтыя „дурακі" выраслі і, як узор, несьлі антыкультуру сваіх настаўнікаў у жыцьцё. Гэта было зачараванае кола. (Дарэчы, і ў інстытуце будучых настаўнікаў вучылі прафесіі. Што тычыцца самога „вобліку" настаўніка як чалавека, то гэтаму не вучылі. Праўда, быў прадмет „савецкая педагогіка" – які прадмет, такая і навука для студэнта-педагога.)

Сістэма выхаваньня і адукацыі была сьціраваная на тое, каб школьнікі адпавядалі нейкаму штучнаму агульнаму стандарту. Але ў школе, аднак, вельмі шмат залежыла ад індывідуальнасьці настаўніка. Акрамя таго, пасьля заняткаў школьнікі усё ж былі вольнымі. А вось тыя, што былі ў „інтэрнаце", гэтай волі ня мелі.

* * *

Наш „настаўніцкі" службовы дом стаяў якраз паміж двума інтэрнатамі. Наша кватэра была на трэцім паверсе і вокны выходзілі на стадыён маміннага інтэрната. У суботу пасьля заняткаў дзяцей забіралі дадому бацькі, у інтэрнаце ж заставаліся дзеці, у якіх бацькоў не было ці яны былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Калі набліжаўся абед, з будынку інтэрната выбягаў дзяжурны „выхавацель" і крычаў: „Сіроты, абедаць!" Гэтае „сіроты, абедаць" уражвала мяне, 11-гадовую дзяўчынку, але не дарослых „пэдагогаў". Мама заўсёды абуралася такімі адносінамі і вельмі шкадавала гэтых абдзеленых дзяцей, але, зразумела, зьмяніць нічога не магла.

З „сіротамі" на выходныя заўсёды заставаўся дзяжурны выхавацель. (Гэта была як бы дадатковая праца, па жаданьню.) У выходныя плацілі, здаецца паўтары стаўкі. А вось у сьвяты плацілі двайны аклад. Мама заўсёды старалася запісацца працаваць на выходныя, а вось на сьвяты ёй гэта не ўдавалася амаль ніколі. Памятаю, парторг Марыя Сямёнаўна гаварыла маме: „У сьвяты працуюць толькі камуністы. Ты, Маргарыта, не камуніст, дык і ня лезь." Мама спрабавала запярэчыць, але што можна было даказаць партогру – нічога.

Усё гэтае жыцьцё было для нас з мамай чужым. Але мы не засяроджваліся на цяжкасьцях. У мамы была мэта жыцьця – каб я скончыла школу, паступіла ў інстытут і скончыла яго, бо без адукацыі яна не ўяўляла майго нармальнага дарослага існаваньня. А радасьці жыцьця мы шукалі самы. У вольны час мама рэгулярна вадзіла мяне ў тэатр, асабліва любіла ў Опэрны. Так зь дзяцінства я палюбіла „храм мастацтва".

Летам мы з мамай езьдзілі на вёску, у лес. Мама вельмі любіла зьбіраць ягады-грыбы і заўсёды зьвяртала маю ўвагу на прыгажосьць лесу, узгорка, на прывабнасьць суніцаў у траве, на дзівосны „голас" леса, на ягоны шум і цішыню, на гойданьне дрэваў над нашымі галовамі, на сонечныя праменьні скрозь сосны – і я прыглядалася і прыслухоўвалася. Так паступова ў маю істоту ўваходзілі тыя каштоўнасьці, якія мне старанна прывівала мама. І потым, калі я ўжо стала дарослай, у які б іншы лес я ні трапляла – ці то на Лепельшчыне, ці то на Бягомельшчыне, ці Гарадзеншчыне – у мяне заўсёды было адчуваньне свайго, лагойскага лесу і краявіду, і я са зьдзіўленнем думала: „Вось жа першы раз я тут, а як бы даўно ведаю гэтыя мясьціны, яны мне мілыя і – мае". І радвалася гэтым сваім думкам.

На Беларусі так было заўсёды ў любым „незнаёмым" „новым" месцы. А вось за мяжой маёй Беларусі такога адчуваньня ўжо не бывала ніколі. Наадварот, ловіш сябе на думцы: „Усё такое ж: і трава, і краскі, і сьцяжынка, і дрэвы, а – не маё. Усё гэта прыгожа, а сэрца ня грэе. Душэўнага яднаньня з „чужой" прыродай чамусьці не адбываецца. Чужая прыгожая прырода як бы сама па сабе, а я – сама па сабе. Чаму так адбываецца? Ня ведаю. Пэўна, тут ёсьць нейкая Боская таямніца.

Здараліся і мінуты забыцьця. Глядзіш так на зялёную траву і кветкі і здаецца – ты на радзіме. А потым раптам пачуеш голас за вакном на чужой мове – і вяртаешся ў рэальнасьць.

І ўспамінаеш простых вясковых жанчын у гумовых ботах, якія ідуць па журавіны ў балоты, і зайздросьціш іхнаму шчасьцю зьбіраць сёньня свае ягады на вечнай сваёй зямлі. А потым думаеш, ці ж вечнай, бо голас рускага акупанта зноў скрыпіць недалёка. А мы, даверлівыя беларусы, нават не зьвяртаем увагі, як ён падбіраецца пад наша быцьцё.

У сваім вольным доме-радзіме мы зможам паправіць і палепшыць усё, што нас не задавальняе. Калі ж страцім незалежнасьць і гаспадарыць у нашым родным доме стане расеяц і кожны чужак, то што гэта будзе за жыцьцё. Так і будуць беларусы хадзіць з увогнутымі шыямі, пакуль ня вымруць. І гэта нашчадкі Вялікага Княства!?

Усё гэта я вельмі добра ўсьвядоміла за мяжой. У чужой краіне ты госьць. Ёю распараджаюцца яе гаспадары – і гэта справядліва. Але тут, за мяжой, я востра адчуваю сваю Бацькаўшчыну, якую вымушана была пакінуць, шчымліва разумею і ведаю, што ў мяне ёсьць мая зямля, народ, свой дом, свой лад жыцьця, свой вобраз думаньня і мэнтальнасьць. Гэтага нельга страціць. І каб гэта нам заўсёды было, я б магла (мне здаецца) ахвяравацца нават жыцьцём.

***Галіна Пазьняк***

## ЛІЦЭЙСКАЯ САЛІДАРНАСЬЦЬ

Яны вучыліся ў Беларускім Гуманітарным Ліцэі імя Якуба Коласа. Вучыліся пасьпяхова. Вядомая сваёй беларускасьцю, высокім узроўнем адукацыі, дэмакратычным змагарным духам сталічная ўстанова была сапраўднай alma mater (маці-карміліцай) для дзяўчат і хлопцаў. Але даўно ўжо ў Ліцэі назіраліся працэсы, якія бянтэжылі навучэнцаў і іхных бацькоў. Трывожылі ня толькі спробы рэжыму ліквідаваць адзіны ў краіне сапраўды беларускі Ліцэй. Але таксама й паводзіны кіраўніцтва Ліцэю, перш за ўсё ягонага дырэктара сп. Ул. Коласа. Нягледзячы на патрабаваньні Бацькоўскай рады сп. Колас на працягу гадоў не зрабіў аніводнай справаздачы пра выкарыстаньне грантаўскіх сродкаў, якія паступаюць для Ліцэю з розных краінаў і фондаў. „Таямніцы ліцэйскага двара” сталіся правілам для элітарнага кіраўніцтва. З цягам часу зьмяніліся й традыцыі ліцэйскага жыцьця. Так, увесну 2006 г. адміністрацыя звольніла як „недобранадзейных” настаўнікаў беларускай мовы і фізікі, выдатных спэцыялістаў, якіх вельмі любілі студэнты. Навучэнцы выступілі з пратэстам супраць несправядлівасьці. Сп. Колас у кастрычніку 2006 г. падмахнуў загад аб выключэньні вучняў з Ліцэю.

12 хлопцаў і дзяўчат адзінаццатай клясы фактычна апынуліся на бруку. У савецка-расейскую школу рэжымнага тыпу яны ўжо ня могуць вярнуцца – настолькі задушлівая там атмасфэра пасьля шматгадовага існаваньня ў ліцэйскім брацтве. Творчая моладзь вырашыла не здавацца і стварыла сваю ініцыятыву пад дэвізам „Ліцэйская Салідарнасьць”. Штодня яны зьбіраюцца на кватэры ў аднаго з салідарнікаў і праводзяць заняткі паводле ліцэйскай праграмы. З навучэнцамі займаюцца настаўнікі. Праводзяцца ўрокі, сэмінары, абмеркаваньні (па ўсіх прадметах на беларускай мове). Вядзецца падрыхтоўка да выпускных экзаменаў.

Мы спыталіся ў ліцэістаў пра іхныя далейшыя пляны. Усе яны зьбіраюцца паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Кожны абірае свой шлях. Сяргей марыць стаць спэцыялістам міжнароднага мэнэджмэнту, Ганна захапляецца кітаістыкай, Іна будзе спартовым трэнерам, Таня – псіхолягам, Віка – рэжысёрам-дакумэнталістам, Аляксандра цікавіць сацыялёгія, Андрэя – юрыспрудэнцыя, яшчэ адна Ганна хоча займацца гісторыяй мастацтва. Яны – вельмі розныя па сваіх навуковых прыярытэтах і схільнасьцях, па характарах і тэмпэрамэнтах. Але іх аб’ядноўвае любоў да ведаў, ліцэйская вернасьць роднай культуры і мове, жаданьне зрабіць сваю радзіму-Беларусь дэмакратычнай і эўрапейскай краінай.

У няпростых умовах, у змаганьні фармуецца нацыянальная беларуская – сапраўдная эліта. На фоне рэжымнай дэмаралізацыі грамадства, шалёнай русіфікацыі моладзі сустрэча зь дзяўчатамі і хлопцамі „Ліцэйскай Салідарнасьці” дае сьветлыя і аптымістычныя ўражаньні. Яны, а не чужынцы-цемрашалы, будуць вызначаць будучыню нашай Беларусі.

***Янка Базыль***

## У ЧЫМ СУТНАСЬЦЬ НАФТА-ГАЗАВАЙ ВАЙНЫ ПАМІЖ РЭЖЫМАМІ ПУЦІНА І ЛУКАШЭНКІ.

Найперш гэта канфлікт паміж саўдзельнікамі адной справы – усталяваньня гэбоўскай улады над постсавецкай прасторай. Дыктатары ня могуць аб’ядноўвацца, павінен застацца нехта адзін, хто будзе кіраваць нічым ня дзелячыся.

Дзеля захаваньня ўлады пуцінская група зрабіла стаўку на фармальнае „аб’яднаньне” (на справе на інкарпарацыю) зь Беларусяй і потым на новыя выбары прэзыдэнта гэтага квазідзяржаўнага ўтварэньня. Аб уладзе над „квазі” Лукашэнка з Пуціным якраз і не дамовіліся.

Тады Пуцін, якога падціскаюць выбары, ужыў супраць саўдзельніка любімы прыём сьледчага НКВД – пальцы ў дзьверы і – „отвечать!” Расейцы скарысталі свой нафта-газавы манапалізм і накінулі на шыю Беларусі пятлю, хочучь задушыць нашую эканоміку і прымусіць Лукашэнку здацца ў Расею (здаць Беларусь). Гэта ня проста разбой. Гэта грубая палітычная агрэсія і эканамічная вайна супраць нашай краіны. Расея тут парушыла ўсе законы, нормы і дамоўленнасьці. Пазыцыя Масквы тут нецывілізаваная, разбойная і агрэсіўная.

Але ў выніку гэтага канфлікту і гэтай палітыкі ў закладніках апынуўся ўвесь Беларускі народ. Пальцы шчымяць рэжыму, а балець будзе беларускаму народу.

Склалася такая сітуацыя, што шкурныя інтарэсы дыктатара ў пэўных аспэктах супадаюць з нацыянальнымі інтарэсамі народа. Выпадак тыповы і небясьпечны. Што рабіць беларусам у такім становішчы? Тым больш што рэжым бароніцца ад расейскай удаўкі рашуча (прынамсі на словах) і адэкватна. І аб’ектыўна на карысьць Беларусі.

Задача відавочная. Беларусам найперш трэба абараніць свае нацыянальныя інтарэсы, а потым, абараніўшыся ад агрэсіі Расеі, ліквідаваць прамаскоўскі рэжым.

Нягледзячы на часовае супадзеньне задачаў, катэгарычна нельга аб’ядноўвацца з рэжымам Лукашэнкі. Бо рэжым, як толькі атрымае пэўныя палёгкі і абяцаньні ад Масквы, тут жа адмовіцца ад барацьбы і здасьць Беларусь, а той, хто зь ім супрацоўнічаў – стане саўдзельнікам у злачынстве.

Беларускі народ, беларускія адраджэнцы і ўвесь Беларускі Вызвольны рух павінен сам змагацца з расейскай агрэсіяй, не зважаючы супадае гэта зь дзеяньнямі рэжыму ці не. Беларускі народ і ягоныя прадстаўнікі заўсёды павінны заставацца самымі сабой і самастойнай палітычнай сілай. У гэтым прынцып і залог перамогі.

Сёньня мы бачым некаторых, што гатовыя ўжо падтрымаць рэжым. Але шмат ёсьць розных „эканамістаў”, „юрыстаў” ды „журналістаў”, якія камэнтуюць канфлікт, паддакваючы цяпер нашым непрыяцелям расейцам, часам з жаданьня „насаліць” Лукашэнку. З гісторыі, аднак, вядома, што той, хто выступаў „за поражение своего правительства (країны) в войне”, гаварыў гэта за вялікія нямецкія грошы. Аналёгія вельмі празрыстая датычна некаторых лукашэнкаўскіх „апазыцыянераў”, аматараў езьдзіць у Маскву ды Брусэль.

Для канфлікту паміж дыктатарамі характэрна таксама нязьменнасьць іхняе ўнутранае палітыкі. Яна не зьмяняецца ні пры якіх абставінах, як не зьмяняецца тыпаж пры ўладзе. Як былі антыбеларускія рэпрэсіі, так і застаюцца; як перасьледвалі беларускую моладзь, так і перасьледуюць; як нішчылі беларускую адукацыю так і нішчаць; як была русіфікацыя так і застаецца, нягледзячы на ўсю супрацьрасейскую рыторыку.

Каб ня быць закладнікамі варожых сілаў, беларусам трэба арганізоўвацца і самым стаяць за сябе.

***Зянон Пазьняк***

*7 студзеня 2007 г.*

# „ПАРАЛЕЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ"

Адной з прычынаў пазанацыянальнага існаваньня шмат якіх беларусаў зьяўляецца магчымасьць арганізаваць сабе „паралельнае жыццё" пад антыбеларускім рэжымам. Дэвізам гэтай пазыцыі ёсьць „Главное ни во что не вмешиваться, не засветиться". Зьнешне лаяльныя грамадзяне шукаюць паралельныя хады, каб выжыць са сваімі сем'ямі.

Дыктатура пад камандай Масквы разбурыла беларускую эканоміку, стала немагчыма працаваць за капейкі на радзіме. І больш за мільён людзей самага актыўнага вытворчага ўзросту паехалі за мяжу, у асноўным у тую ж Расею. Іх там зьбіваюць, абрабоўваюць, забіваюць, зьневажаюць. Але значнай частцы ўсё ж удаецца зарабіць пэўныя сумы, каб сем'і маглі выжыць. Хітрэйшыя і больш падрыхтаваныя падаліся на Захад. Моладзь ужо шэраг гадоў пасьля краху СССР працуе на прасторах Эўразьвязу і ЗША. Вяртаецца дахаты з грашыма, пачуваецца камфортна. І, хаця гэтым маладым „не по душе" дыктатура, але „жить можно, лишь бы ни во что не соваться и не засветиться".

Зянон Пазьняк і іншыя патрыёты Беларусі даўно папярэджвалі, што схема паралельнага жыцьця ня можа існаваць вечна, што антыбеларуская паліцэйшчына задушыць апошнія парэшткі свабоднай ініцыятывы, што трэба абараняць сваю свабоду, змагацца за дэмакратычную эўрапейскую Беларусь, салідарна супрацьстаяць русіфікацыі і расейскаму імпэрыялізму. Але многім беларусам ва ўсё гэта „неяк ня верылася", яны спадзяваліся, што „на іхны век хопіць" і што ніхто іх не зачэпіць.

Гэтакім людзям прапануем, між іншым, пачытаць „Белгазету" за 16 кастрычніка, а менавіта артыкул „Поработал – заплаті". Гэта ёсьць інтэрв'ю з намміністра МУС РБ А. Бягуном. Цытуем рэдакцыйную частку артыкула: „Речь идёт о гастарбайтерах – мускулистых парнях на российских стройках и привлекательных бебиситтерах в американских семьях. Отныне о них задумались в МВД, подсчитав, что всех необходимо „принудить легально заниматься трудовой деятельностью".

Чытачу прыйдзецца, аднак, доўга ўглядацца ў міністэрскі лубок, фальшывую карцінку пра жыццё і працу беларусаў у Расеі: „В Россию едут молодые мужчины, которые вместо деревни хотят жить в Москве, пусть и на съёмной квартире..." (Як ўсё гэта нагадвае „карцінкі" і агітацыю часоў гітлерскага „райху", калі запрашалі на працу ў Нямеччыну). Намміністра МУС у адным месцы, праўда, гаворыць пра галоўнае: „Государство вынуждено разработать комплекс мер, чтобы воздействовать на процесс. Карательные санкции пока не перечислю: они находятся в разработке, причём этим занято не только МВД…"

Што называецца, дзякуй на „добрым слове". Рэжым зрабіў усё, каб пазбавіць наш народ магчымасьці працаваць і зарабляць на жыццё на радзіме. Сотні тысячаў людзей падаліся за мяжу. Цяпер паліцэйскія патрулі будуць высьвятляць непасрэдна па месцы жыхарства ў перапужаных сямейнікаў, дзе падзеліся і што робяць іхныя работнікі. Калі гастарбайтэры будуць вяртацца і перасякаць мяжу Беларусі, іх ужо будуць чакаць чыноўнікі рэжыму з карніцкімі паўнамоцтвамі. Вядома, што абсалютная большасьць нашых людзей выяздждае на працу за мяжу нелегальна. Зразумела, што ў гэтых ***карніцкія чыноўнікі будуць адразу адбіраць усе грошы.*** „Шчасьліўчыкі", якія працавалі ў Эўропе і Амэрыцы легальна і маюць на ўсё паперы, ***павінны будуць аддаць значную частку заробку (магчыма палову і больш).***

Здавалася б, кожная дзяржава бярэ падаткі. Але ўсе мы разумеем, што антыбеларускаму рэжыму патрэбна ў чарговы раз проста абрабаваць беларусаў. Бо бракуе грошай на паліцэйска-гэбоўскія дывізіі, на легіёны бюракратыі, на шклоўскія ракеты, зімовыя палацы, „агрогородкі" і іншыя звыродлівыя экспэрымэнты дыктатуры. Паралельнае жыццё канчаецца, як канчаецца любая спроба прыстасавацца да антычалавечага рэжыму. „Неяк праіснаваць", „неяк перахітрыць" прамаскоўскую сістэму ўлады ня ўдасца. Яна забярэ апошнюю капейку, яна ня зьлітасьцівіцца над маўклівымі і пакорлівымі. Толькі народная салідарнасьць у змаганьні за вызваленьне Беларусі ёсьць шляхам да нармальнага цывілізаванага жыцьця. Але ці здольныя змагацца за свабоду людзі без Айчыны ў сэрцы?

***Валеры Буйвал***

# АБ АНТЫБЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ РАСЕІ І ЗМАГАНЬНІ СУПРАЦЬ ЯЕ

Толькі што прамінуў пік чарговага канфлікту паміж Пуціным і Лукашэнкам. Паступова ўсё вяртаецца да ранейшага інтэграцыйнага маразму, і гэтая палітыка будзе працягвацца далей з абодвух бакоў.

Пра канкрэтныя прычыны і сутнасьць сваркі я ўжо пісаў – гэта імкненьне пуцінскай групы ўлады ў Маскве выйсьці на трэці (новы) прэзыдэнцкі тэрмін шляхам інкарпарацыі Беларусі і правядзеньня выбараў прэзыдэнта ў нібыта новай „саюзнай" дзяржаве. Аднак прэзыдэнт павялічанай імпэрыі мусіў быць адзін, а прэтэндэнты – два. Таму канфлікт паміж гэтымі саўдзельнікамі быў непазьбежны.

Усё гэта ёсьць злачынная і брыдкая антынародная гульня. Але прыходзіцца пра яе казаць, бо такая рэальнасьць вычварэнскай імпэрскай палітыкі.

Імкненьне Пуціна па-гэбоўску загнаць суперніка ў кут скончылася фіяскам і палітычнай паразай Пуціна. Тым ня менш пуціністы здолелі фармальна захаваць твар і ў выніку Беларусь прайграла эканамічна. Скандалісты вярнуліся на зыходныя і, дарэчы, агульныя палітычныя пазыцыі. „Інтэграцыя" працягваецца. І будзе працягвацца. Гэта толькі эўфімізм імпэрскай палітыкі. Тут не мяняецца нічога. У студзені працягваецца стварэньне на Беларусі адзінай расейска-беларускай (а фактычна – расейскай) сістэмы супрацьпаветранай абароны (СПА), функцыянуюць усе (патрэбныя Расеі) псэўдаструктуры так званай „саюзнай дзяржавы", адчыненыя межы і г.д. У афіцыйнай Беларусі ніхто не шукае і не думае ні пра якія эканамічныя, энергетычныя і іншыя альтэрнатывы. Усё гэта паказвае на непрынцыповасьць канфлікту, што зноў пераходзіць у зацяжное суперніцтва, небясьпечнае для народу Беларусі (які, паўтаруся, знаходзіцца ў закладніках гэтай авантурнай палітыкі дзьвюх асобаў).

Можна не сумнявацца, што пасьля таго, як не ўдалася спроба зламаць саўдзельніка з наскоку, Масква будзе паступова, крок за крокам зацягваць энергетычную пятлю на шыі Беларусі. Тут тыповае энкавэдзісцкае разуменьне палітыкі. Іншай яны не ведаюць. Аднак палітычна Лукашэнку гэта ўжо мала зашкодзіць (бо час працуе не на Пуціна). Гэта зашкодзіць Беларусі і перш за ўсё – канчатковым зьнішчэньнем беларускага прадпрыймальніцтва.

Падвышэньне ў два разы цэнаў на энергетычныя рэсурсы пры адчыненай мяжы з Расеяй можа выклікаць перавод беларускіх бізнэсовых вытворчых прадпрыемстваў (што спажываюць энергію) і капіталаў у Расею (у Смаленшчыну, Браншчыну, Пскоўшчыну і г.д.), дзе энергія танейшая. Ствараецца нахільная плоскасьць, лейка, у якую пачне зьліваціа беларускі вытворчы бізнэс. А гэта і падаткі, і працоўныя месцы, і капіталы, і тэхналёгіі, і разьвіцьцё вытворчасьці. Тут велізарныя страты і гарантаваная адсталасьць для краіны з высокім беспрацоўем. Замест каб разьвіваць Беларусь, беларусы будуць падымаць Расею (праўда, калі расейскі крымінальны бізнэс дазволіць ім гэта рабіць; будуць плаціць „падаткі" яшчэ і „росбізнэсу").

Штучным беспрацоўем і адчыненымі межамі ўжо даўно створана сітуацыя, што амаль мільён беларусаў працуе ў Расеі і на Расею. Цяпер туды зьбіраюцца сьпіхнуць і беларускі вытворчы бізнэс. Складваецца ўражаньне, што пра гэта ў рэжымных колах ніхто ня думае (ці думаюць „наадварот"). Але ў Маскве, не сумняваймася, усё пралічылі.

Каб запабегчы гэтаму заплянаванаму абяскроўленьню беларускай эканомікі, трэба тэрмінова зрабіць нармальную дзяржаўную мяжу з Расеяй і праводзіць адпаведную ўнутраную эканамічную палітыку. Тым часам Лукашэнка ўжо заявіў, што „яны" (рэжым) не зьбіраюцца ўводзіць які-небудзь кантроль на мяжы з Расеяй. Выглядае, што рыхтуецца заплянаванае самагубства нашай краіны, і рэжым, як заўсёды, гэтаму спрыяе.

Тут варта нагадаць, што адно з найвялікшых злачынстваў рэжыму Лукашэнкі, зробленае ім за дванаццаць гадоў аўтарытарнага кіраваньня, – гэта прывязка беларускай эканомікі, гандлю і энергетыкі да Расеі. Прывязка рабілася сьведама і пачалася адразу, у 1994 годзе. Тады ні з таго, ні з сяго пачалі пераводзіць аб'екты беларускай вытворчасьці, кацельныя і г.д. з мазуту на газ. Хаця газ абыходзіўся даражэй на 30 адсоткаў, чым мазут, а ў Беларусі была свая нафтаперагонная вытворчасьць і нават свая нафта (тады здабывалі

два мільёны тон). Гэта быў пачатак мафійнай стрыжкі купонаў і запраданьня Беларусі. Што ёсьць цяпер і што адбываецца далей – мы бачым.

Трэба ўлічыць, што пагроза для суверэнітэту, волі і інтарэсаў Беларусі складваецца вельмі сур'ёзная. Найперш, як выявілася, задушэньне Беларусі Масква ўзгадніла зь немцамі (а значыць з Эўропай, бо цяпер немцы верхаводзяць у Эўразьвязе). З другога боку пуціністам няма куды дзявацца, яны рэальна могуць страціць уладу ў Расеі і пачнецца чарговы „передел" (і „беспредел"). Таму ціск на Лукашэнку і маніпуляцыі з так званай „інтэграцыяй" і „саюзнай дзяржавай" будуць працягвацца. Тут могуць скарыстаць і ціск, і подкуп, і ашуканства – увесь ужо вядомы з гісторыі імпэрыі арсенал.

Варта зьвярнуць увагу ў сувязі з гэтым на паводзіны ў час нафта-газавай сваркі так званай падстаўной „апазыцыі" і ўвогуле ўсіх гэтых нібыта „эканамістаў", „юрыстаў" і т.п. „спэцыялістаў". Відовішча проста шакуе. Усе яны тонам і зьместам апраўдвалі расейскія паводзіны, радаваліся з „паразы", як яны лічаць, Беларусі і ўсяляк грэбліва выказваліся пра сваю краіну. Для іх Лукашэнка – гэта Беларусь, а нацыянальныя беларускія інтарэсы – гэта Лукашэнка. „Так што няхай ведаюць расейцы , зь якой краінай маюць справу", – зларадна ўсклікае „экспэрт" Л. Злотнікаў у інтэрв'ю „Свабодзе".

* * *

Рэальныя спадзяваньні цяпер могуць быць на новае пакаленьне. І дзеля гэтага павінна рабіцца асноўная наша нацыянальна-асьветніцкая праца і нацыянальна-асьветніцкая палітыка. Цяпер, улічваючы небясьпеку, трэба рабіць наступныя канкрэтныя крокі. Выходзім з падставы, што абараніцца і перамагчы можам толькі абапіраючыся на свой народ, сваю нацыю, сваю моладзь і сваё грамадзтва.

Трэба шырока ўрухоміць канцэпцыю БНА (Беларускага Нацыянальнага Адраджэньня). Гэта канцэпцыя беларускага асьветніцкага руху з дыскрэтнай гарызантальнай структурай (аўтаномныя групы па 3-5, максімум 7 асобаў). Галоўная задача – беларуская нацыянальная асьвета ў Інтэрнэце, пашырэньне беларускамоўных „сайтаў" інфармацыйна-асьветніцкага кшталту, накапленьне нацыянальнай інфармацыі і множаньне беларускіх культурных здабыткаў у Інтэрнэце. Групы БНА могуць займацца таксама іншай асьветніцкай працай на Бацькаўшчыне, абыходзячы рагаткі прамаскоўскага рэжыму. Пры гарызантальнай сістэме і аўтаноміі структураў рух фармальна незьнішчальны. Мэтадычную дапамогу руху будуць рабіць старэйшыя адраджэнцы і арганізацыі. Практычна ўжо створана базавая суполка – „Беларускі Маладзёвы Рух Амэрыкі" –, якая дапамагае ў стварэньні беларускамоўных „сайтаў", выдзяляе бясплатныя „гостынгі" на беларускамоўныя асьветніцкія і некамэрцыйныя старонкі. БНА – гэта можа быць сусьветны асьветніцкі беларускі рух у Інтэрнэце. Беларусы, якія нават сядзяць у Аўстраліі ці на Мадагаскары, могуць прымаць у ім удзел.

Ізноў узьнікла сітуацыя, калі неабходна аднавіць дзейнасьць БКА (Беларускага Камітэту Абароны), створанага ў 2002 годзе пасьля пуцінскіх „мухаў-катлетаў" і адкрытай палітычнай атакі на незалежнасьць Беларусі. Неабходна аднавіць групы і друкаваныя выданьні, што ў 2002-2004 гг. выдавалі БКА і мясцовыя камітэты абароны, і адрадзіць усю дзейнасьць, апісаную ў інструкцыях і бюлетэнях БКА.

БКА мае таксама гарызантальную і дыскрэтную структуру аўтаномных суполак (3-7 асобаў), мэтадычны цэнтар і Камітэт. Заклікаю найперш маладых беларусаў на ўсіх узроўнях уключацца ў змаганьне супраць антыбеларускай расейскай імпэрскай палітыкі і за вольную Беларусь. Памятайма, што калі ня будзем змагацца, то на галаву нам сядзе масковец і ськінуць яго тады можна будзе толькі сілаю зброі. Лягчэй яго проста не пусьціць у хату, чым вытурваць праз вакно пасьля таго, як ён зьнішчыць нашае жыльлё.

Камітэты абароны нябачна мусяць быць усюды: на прадпрыемствах і ў інстытутах, ва ўстановах і структурах, нават там, дзе іх ніхто не спадзяецца. Беларусь мусіць змагацца. Хопіць назіраць вечнае паражэнства, апатыю і пустазвонства. Настае адказны час і беларусы не павінны яго страціць.

***Зянон Пазьняк***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*21 студзеня 2007 г.*

# КАЛЯДКІ Ў ТАВАРЫСТВЕ

13 студзеня 2007 года ў Таварыстве Беларускай культуры ў Летуве адбылося сьвяткаваньне Старога Новага года і Калядаў. Залю ўпрыгожылі ў стылі мадэрн (гэтым прафесійна займалася вядомая беларуская мастачка Хрысьціна Балаховіч). На сьцяне зіхацелі папяровыя зорачкі, на стале - навагодні букет.

Распачаў імпрэзу старшыня ТБК Хведар Нюнька, ён павіншаваў прысутных з наступаючым Новым 2007 годам, пажадаў плёну ў асабістым і грамадзкім жыцьці, больш рабіць намаганьняў і высілкаў на карысьць Бацькаўшчыны. У прыватнасьці адзначыў працу „сянюнаса" (войта) „Вяркяйскай" (Веркі) „сянюніі" г.Вільні Вацлава Гульбіновіча, кіраўніка „сянюніі", якая заняла першае месца сярод дваццаці ў горадзе па выніках працы за мінулы год, а Вацлаў яшчэ зьяўляецца чальцом рады ТБК, дзе таксама шмат працы.

У таварыстве за мінулы год прайшло шмат значных мерапрыемстваў, сярод іх дні беларуска- летувіскай культуры, прысьвечаныя 100-годзьдзю „Нашай Нівы", прэзэнтацыя кнігі Ул.Пецюкевіча „Узьняўся белы птах", на якой прысутнічалі госьці з Італіі і Беларусі, прэзэнтацыю кнігі М.Казлоўскага „Галасы разбуджаных птушак", якая ўвайшла ў сьпіс лепшых кніг мінулага года.

Наступным выступоўцам быў сябра таварыства, карэспандэнт радыё „Палёнія" Андрусь Старавойтаў. Ён эмацыйна распавёў пра палітычнае становішча на Беларусі, гаварыў пра тое, што адбывалося ў Вільні 13 студзеня 1991 года, тады ў абарону незалежнасьці Летувы сталі прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяў, сярод узнагароджаных мэдалямі ёсьць дзесяць беларусаў, у тым ліку тры сябры таварыства.

Алесь Адамковіч распачаў цыкл лекцыяў „Беларускія карані на Віленшчыне", першую лекцыю прысьвяціў ксяндзу Юрыю Матулевічу – шчыраму абаронцу вернікаў - беларусаў. Летувіс па нацыянальнасьці стаяў на баку дыскрымінаваных польскімі ўладамі беларусаў, за што таксама цярпеў пераслед. Як сьвятар ён змагаўся за тое, каб вернікі зьвярталіся да Бога на роднай мове. Прайшлі гады, і шчырыя вернікі-беларусы ў знак пашаны прысьвяцілі першую лекцыю сьвятару Ю.Матулевічу.

Андрусь Старавойтаў прасьпяваў гімн „Магутны Божа" на словы Натальлі Арсеньневай.

Мастак Алег Аблажэй паказаў апошнія ілюстраваныя ім кнігі казак, якія выйшлі ў выдавецтвах Летувы, Расеі, Польшчы, падзяліўся творчымі плянамі.

Напрыканцы афіцыйнай часткі прысутныя ў залі паглядзелі відэафільм „Белы легіён", зьняты польскім рэжысёрам у 2006 годзе, які сваім патрыятычным зьместам нікога не пакінуў абыякавым.

Завяршылася мерапрыемства за сьвяточным сталом.

***Леакадзія Мілаш***

# ЗЯНОН: ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ ВАСЬМІДЗЕСЯТЫХ ГАДОЎ

***(З ЦЫКЛУ „ЛІСТЫ ДА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ") :***

**Сьвятло любові**

Як добра сузіраць
Ціхую Тваю красу;
Твой погляд,
пoўны пяшчоты і ласкі.
Быццам срэбныя промні
ў майскую ноч
Плывуць з-за празрыстых хмар.

*1985 г.*

### *(З ЦЫКЛУ „ ЧУЖАЯ ВАЙНА”) :*

**Вяртаньне з Аўганскай вайны**

„Іванька малодзенькі
Ідзе невясёленькі...”
*(З народнай песьні)*

Іванка вяртаўся.
Як здоўжыўся шлях над гарамі.
Дзе Вы, бацька мой любы
І маці мая любая,
Што на заводзе футаралаў
Фарбуе тэлевізары...
Як гайдаецца цынкавы мой самалёт
Над Дзьвіной,
Як воблакі серабрацца...
А вунь у садочку дзяўчына мая.
А вунь на парозе матуля мая.
А вунь каля брамы мой бацька стаіць...
Не спаткай, не глядзі на мяне да
сьвітаньня.
Не кладзі мне
чырвоныя кветы.
Лепш хай прыме труну
той маскаль-ваенком.


(Фота З. Пазьняка. 1964 г.)

*Расейцы.*

Мне яго не дастаць з таго сьвету.
Паслухайма...
Як чыркаюць вераб’і на могілках
У бэзавых кустах,
Як лісьце шуміць у таполі.
Там, далёка, ў пустыні сухой,
Дзе вецер гарачы на волі,
Плача Фатх і бедная Сулейма
Над сынам сваім у юдолі.
Праклінае мяне ў труне.
Праклінае мяне ў палёце.
Праклінае мой край,
Праклінае народ мой харошы.
Зірні.., як ластаўкі ў небе лунаюць
Над правадамі.
Напэўна, заплоцяць Табе за мяне.
Талоны на грэчку і льготы...
– Кончаем обряд, – ваенком
загадаў, –
Он долг свой отдал.
Он умер, как все патриоты.

*1988 г.*

### *(З ЦЫКЛУ „ МЕНСК”) :*

**Шэрая патыліца**

Я пайшоў пагуляць
па любімых мясьцінах.
Але на Дамініканскай
Заўважыў перад сабой
шэрую патыліцу.
Яна засланяла муры.
Тады я спусьціўся ўніз
у Траецкі квартал.
Але нічога ня ўбачыў
з-за шэрай патыліцы.
Зайшоў у карчму –
Шэрая патыліца загарадзіла вакно.
Тады я загаварыў з сябрам.
Але ніяк ня мог убачыць
яго аблічча.
Замінала патыліца.
Нічога ня зробіш.
Ехаў дадому і назіраў,
Як трасецца перада мной
шэрая патыліца.
Аж вушы варушацца,
нібы лакатары.
Вышаў раней,
так спракудзілася.
Прыйшоў,
а на лесьвіцу не прабіцца,
У дом не зайсьці –
адна патыліца.
І тут я ня вытрымаў.
Як даў па патыліцы,
Толькі гузікі зазьвінелі.
І падумаў:
От дурны,
трэ’ было адразу даць.

*1986 г.*

### *(З РОЗНЫХ ЦЫКЛАЎ)*

**Страла**

Нацэліў вострыё стралы
У неба.
І звонка зазьвінеў мой лук.
Імкліва пёркі зьніклі ў бяздоньні.
Куды ж ляціць страла?
О, цяжкае зямное прыцягненьне!
Ты падаеш назад.

*1982 г.*


(Фота З. Пазьняка. 1964 г.)

*Рака Гаўя.*

**Водар настурцыі**

Дожджык ноччу адшумеў.
Толькі выйшаў на ганак
чуць сьвет –
Тонкі водар настурцыі
ў летняй цішы
Над срабрыстай расой стаіць.

*1983 г.*

**Паўдзённая цішыня**

Вось затока Гаўі.
У люстры вады нерухома застыла трысьцё.
Раскрываецца белы гарлачык,
І крылы стракоз шапацяць
над плакучай вярбой.
Не гайдаецца бурая раска
Ля сьцябла асакі.
Моцна плюснуў шчупак.
Гэты гук, нібы стрэл у цішы.

**Зімовая ноч удома**

Месячны бляск на падлозе
І цень крыжавіны вакна
Мройна спаўзаюць
пад цёмны парог.
Усяленская ціша ў доме начным.
Срэбрам іней блішчыць
на галінах рабін.
Выглядаю на двор:
Аж іскрыцца асьнежаны тын.

*1983 г.*

**Туга па роднай старане**

Што можа быць страшней
У роднай старане
Тугі па роднай старане.
Што можа быць цяжэй
За адзіноту
Не ў адзіноце.
Пагавару я сам з сабой,
І не ў самоце дзень міне.
Што можа быць цяжэй
Тугі па роднай старане.

*1981 г.*

**Ноччу іду па зімовым лесе**

Вецер начны наляцеў
На засьнежаны ельнік,
На дуб векавы.
Зашумеў, як жывы.
Цьмяна выглянуў месяц з-за хмар.
Агартае дрымота мяне і спакой –
Прачынаюцца продкі ў крыві.
Дружа, лес дарагі,
Пагаворым на мове з табой.

*1984 г.*

## КОБРЫН: „ДЛЯ РАСЕІ – ПАЛКАВОДЗЕЦ, А ДЛЯ НАС – ЗАБОЙЦА”

У Кобрыне пачалося будаўніцтва так званага сувораўскага праваслаўнага храму. Гэтае паведамленьне на „Свабодзе” выклікала шырокае абмеркаваньне ў Беларусі. Грамадзкае таварыства „Бацькаўшчына”, Таварыства беларускай мовы і Саюз беларускіх пісьменьнікаў зьвярнуліся з адкрытым лістом да мітрапаліта Філарэта – яны патрабуюць спыніць будаўніцтва храму-помніка. Аналягічныя звароты накіравалі прэм’ер-міністру Сяргею Сідорскаму, упаўнаважанаму ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Леаніду Гуляку, а таксама кіраўнікам выканаўчай улады Берасьцейскай вобласьці і Кобрына.

***( Паводле радыё Свабода. Вячаслаў Кулік)***

# ФАШЫЗМ У РАСЕІ

У Санкт-Пецярбурзе расейскія фашысты цяжка паранілі антыфашыста. Малады чалавек Іван Елін, вядомы антыфашыстоўскімі поглядамі, вяртаўся дахаты пасьля гуманітарнай акцыі на карысьць бедных. На яго напалі „русские ребята” і нанесьлі больш за дзесяць нажавых ранаў, юнак знаходзіцца ў цяжкім стане ў шпіталі.

Вуліцы расейскіх гарадоў усё больш нагадваюць Нямеччыну 1920-30-х гадоў. У гэтай сувязі няхай „скептыкі” пачытаюць артыкул Зянона Пазьняка „Небясьпека расейскага фашызму”. Артыкул зьмешчаны на старонцы „Беларускай Салідарнасьці”, а таксама на старонцы pbpf.org.

Цікава, што ўпершыню за апошнія гады газэта „Нар. Воля” таксама надрукавала палітычны артыкул Зянона Пазьняка, і менавіта пра расейскі фашызм (11 студзеня 2007 г.). Але „істінные демократы” не маглі проста пазнаёміць чытачоў з аналітыкай аўтарства сп. Пазьняка. Пад тэкстам артыкула яны падвесілі ў паўтары разы большыя па аб’ёму „камэнтары спэцыялістаў”. Забясьпечыла камэнтары вядомая спэцыялістка па брудных справах М. Коктыш. А „камэнтатары” проста вартыя адзін аднаго. С. Касьцяна, вядомага неадукаванага бальшавіка-цемрашала мы цытаваць ня будзем. Таксама як і В. Ухналёва, дырэктара Фонду інтэграцыі Беларусі і Расеі. Хітранька выказаўся Ул. Лабковіч, юрыст з псэўда-БНФ Вінцука Вячоркі: „Прыпісваць сёньняшнюю беларускую апазыцыю да нейкіх „маскоўскіх праектаў” памылкова...” З той жа груповачкі падала голас Т. Ваніна: „Расея – наша суседка. І ад гэтага факта нам нікуды ня дзецца. І калі ты сапраўдны палітык, то мусіш будаваць адносіны з усімі краінамі, нават калі іх кіраўніцтва цябе нечым не задавальняе”.

Для гэтай публікі расейскага фашызму няма, а думкі сп. Пазьняка і іншых беларускіх патрыётаў пра небясьпеку расейскага фашызму – „навязьлівая ідэя”. Цікава атрымліваецца: нават на афіцыйных расейскіх тэлеканалах і ў газэтах абмяркоўваецца „апошние злачынства фашыстаў у Пецярбурзе”, а для гэтай публікі, што адзначылася ў „Нар. Волі”, „такой зьявы не існуе”.

### *Хроніка рускага фашызму*

Маскоўскія фашысты зьдзейсьнелі чарговае злачынства. 21 студзеня на вуліцы „русские ребята” напалі на падлетка і зарэзалі яго. Матывы зразумелыя. Армянін Артур Марцірасян жыў з сямьёй у Маскве, вучыўся ў сёмай клясе маскоўскай школы. Што там нядаўна пісалі ў „Нар. Волі” розныя пісачыкі? – „расейскі фашызм – гэта навязьлівая ідэя Зянона Пазьняка...” Падстаўную псэўдаапазыцыю трэба было б носам тыцнуць у крывавую Маскву. Можа быць і зразумелі б нешта. Хаця... не тая парода.

***Янка Базыль***

# 10% ДЛЯ РАСЕЙСКІХ ТУРЫСТАЎ.

Аўстрыя ня хоча расейскіх алкаголікаў. 9 лютага на расейскіх тэлеканалах забілі трывогу. Папулярныя аўстрыйскія горналыжныя курорты і міністэрства турызму Аўстрыі заявілі аб усталяваньні квоты на „отдыхающчіх” з Расеі. У будучым у гэтых месцах іх павінна быць ня больш за 10% ад агульнай колькасьці турыстаў. Цяпер гэты адсотак складае больш за 50%.

Аднак, гэта ня значыць, што расейскія рабочыя, сяляне і акадэмічная інтэлігенцыя масава езьдзяць на лыжах у аўстрыйскіх Альпах. Не, проста кліенты з цывілізаваных краінаў больш не прыяжджаюць у Аўстрыю. Засталіся толькі „русские ребята” (крамлёўцы, лубянцы, кілеры, злодзеі, мафіёзы), якія шпурляюцца пачакамі крывавых даляраў, але здолелі напалохаць усіх астатніх эўрапейцаў сваім п’янствам, хамствам і агрэсіўнасьцю (яны проста паводзяць сабе „как дома”).

Аўстрыйцы палічылі за лепшае адмовіцца ад пьяных рускіх „кодлаў” і вярнуць сваю добрую славу камфортных зонаў адпачынку. Яны ўмеюць глядзець у будучыню і падлічваць страты на фоне цяперашніх нібыта шалёных прыбыткаў на ўсходніх алкашах. Эх, як замітусілася Масква! У той жа дзень па расейскіх тэлеканалах пачалі трансляваць нейкія аўстрыйскія тэлефонныя галасы пра тое, што „усё гэта не так, квоты ня будзе, мы рады бачыць у сябе расейскіх турыстаў...” Расейцы б маўчалі ў хустачку пра аўстрыйскую квоту, але пра гэта пачалі ўжо паведамляць ангельскія газэты (вось вам за атамную вайну ў цэнтры Лёндана). Цяпер маскоўскі афіцыёз (і ня толькі з турыстычнай індустрыі) актыўна выкручваецца і блытае сьляды. Але няма куды дзявацца. Пасьля нядаўняй шумнай паліцэйскай аблавы ў францускім Куршавэле, дзе спэцназ заваліў на падлогу нарыльскага мільянэра і віцэ-старшыню Маскоўскай Думы, „зачыстка” расейцаў на заходніх курортах працягваецца. Эўрапейцы стаміліся ўжо ад дэсанту маскоўскіх, піцерскіх і сібірскіх „курортнікаў”.



(Фота Алеся Мілінца)

*Горадня.*

***Янка Базыль***

**З Ь М Е С Т**


1. А. Лукашэнка мусіць адказваць за фальсіфікацыю прэзыдэнцкіх выбараў 19 сакавіка 2006 г. . . . . . 1
2. Патрабаваньне аб адказнасьці за фальсіфікацыю выбараў . . . . . . 2
3. Зянон Пазьняк. Небясьпека для Беларусі. . . . . . 3
4. Юры Беленькі: „З Балта-Чарнаморскім калектарам мы ня мелі б сур’ёзных праблемаў у энэргетыцы . . . . . . 4
5. Янка Базыль. У Вене аб’явіўся апазыцыянер Беларусі і прыхільнік Масквы . . . . . . 5
6. Валеры Буйвал. Ярмошына пахваліла ўдзельнікаў рэжымнай фальшыўкі . . . . . . 5
7. Янка Базыль. Стратэгія супраць Беларусі . . . . . . 5
8. Лютаўскі Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ . . . . . . 7
9. Галіна Пазьняк. Беларусь у сэрцы . . . . . . 7
10. Янка Базыль. Ліцэйская Салідарнасьць . . . . . . 11
11. Зянон Пазьняк. У чым сутнасьць нафта-газавай вайны паміж рэжымамі Пуціна і Лукашэнкі . . . . . . 11
12. Валеры Буйвал. Паралельнае жыцьцё . . . . . . 12
13. Зянон Пазьняк. Аб антыбеларускай палітыцы Расеі і змаганьні супраць яе . . . . . . 12
14. Леакадзія Мілаш. Калядкі ў Таварыстве . . . . . . 13
15. Зянон: Выбраныя вершы васьмідзесятых гадоў . . . . . . 13
16. Кобрын: „Для Расеі – палкаводзец, а для нас – забойца”. . . . . . . 15
17. Юрка Марозаў. Фашызм у Расеі . . . . . . 16
18. Валеры Буйвал. 10% для расейскіх турыстаў . . . . . . 16



*Нумар аддрукаваны пры падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**